

ВАЕННЫ СПЕЦНАЗ ПРАЦУЕ ЦІХА 4

ЯК РАЗГОРТВАЕЦЦА ПАНДЭМІЯ 13



Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

24 КАСТРЫЧНІКА 2020 г. СУБОТА № 208 (29322)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аксана СКІНДЗЕР, начальнік упраўлення нарыхтовак Белкаапсаюза:**

*«Мы сталі прыкладам для гандлёвых сетак па круглагадовай закупцы сельскагаспадарчай прадукцыі. Дзякуючы сельскім жыхарам мы можам папаўняць асартымент на працягу ўсяго года. Прадукцыя ў насельніцтва захоўваецца выдатна, і мы гатовыя яе купляць і рэалізоўваць».*

# УРАДЖАЙ САБРАЛІ, ТРЭБА ТОЛЬКІ МІР ЗАХАВАЦЬ...

**Учора Прэзідэнт наведаў сельгасаб'екты Слуцкага сыраробнага камбіната. У працэсе рабочай паездкі гаварылі не толькі пра сабраны ўраджай і пра цэны, але і пра палітычнае жыццё краіны.**

### КАНТРОЛЬ ЗА ЦЭНАМІ БУДЗЕ СУР'ЁЗНЫ

Адразу пасля прылёту ў Слуцкі раён Прэзідэнт пацікавіўся забяспечанасцю краіны гароднінай, запаўненнем стабілізацыйных фондаў і даў задачу губернатарам і мэру Мінска размеркаваць ураджай такім чынам, каб цэны не скакалі ўзімку і яго хапіла да лета.

Чыноўнікі далажылі, што ўраджай яблыкаў сёлета знізіўся ў параўнанні з мінулым годам, але краіну ўсё ж такі імі забяспечаць поўнасцю. «Не прыйдзецца завозіць яблыкі з Егіпта ці Зімбабвэ? — запытаў Прэзідэнт. — Хай у чалавека будзе выбар. Мы ж не забараняем егіпецкі яблык прадаваць, калі ласка, прадавайце. Але неабходна, каб побач ляжаў свой добры яблык. Глядзіце, усю зіму кантроль за цэнамі будзе сур'ёзны».

СТАР. 2



Фота БелТА.

# На журавінавым «жніве»

На прадпрыемстве «Палескія журавіны», што ў Пінскім раёне, кастрычнік — самая гарачая пара. Тут на самай вялікай плантацыі ў Еўропе плошчай 82 гектары збіраюць у гэты час ураджай журавін. «Жніво» вядзецца «сухім» і «мокрым» спосабамі. На гэтым фота — якраз «мокры», калі спецыяльна абсталяваныя трактары нібыта плывуць па ягаднай плантацыі.





Фота БелТА.

## КОРАТКА

- **Вытворчасць садавіны і ягад у фермерскіх гаспадарках Беларусі вырасла ў 13 разоў.**
- У мемарыяльным комплексе «Рыленкі» адкрылі новую пліту з 41 прозвішчам загінулых воінаў.



- **Медыкі раяць старым людзям па магчымасці заставацца дома і карыстацца анлайн-паслугамі.**
- Амаль 200 кіраўнікоў і юрыдычных асоб Гомельскай вобласці аштрафаваныя за несвоечасовую выплату зарплаты.
- **З пачатку года ў Беларусі ў ДТЗ загінулі 135 пешаходаў.**
- Уся Польшча пераходзіць у «чырвоную зону» з-за ўсплёску COVID-19.
- **У Міністэрстве замежных спраў прайшла цырымонія гашэння маркі да 75-годдзя ААН.**
- Новы парк заклалі ў аграгарадку Трабы Іўеўскага раёна.
- **Прадпрымальнікі і самазанятыя ў 12 раёнах Беларусі атрымаюць кансультацыі бізнес-экспертаў.**

ISSN 1990 - 763X

Актуальна

# АБ'ЯДНАННЕ НЕРАЎНАДУШНЫХ

## Хто можа разлічваць на дапамогу Чырвонага Крыжа падчас распаўсюджання COVID-19



**Пандэмія каранавіруса, якая пачалася мінулай вясной, стала выпрабаваннем для нашага грамадства, у тым ліку — на здольнасць да суперажывання, спагадлівасці і дапамогі іншым. Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа было, бадай, самай актыўнай арганізацыяй, якая аб'яднала нераўнадушных — арганізацыі і людзей, гатовых падтрымаць тых, хто мае ў гэтым асаблівую патрэбу.**

**Больш за 1,8 тысячы валанцёраў па ўсёй краіне, 52 тысячы паслуг па дастаўцы прадуктаў і рэцэптаў і некалькі дзясяткаў тысяч удзячных пажылых людзей — гэта той вынік, якога ўдалося дасягнуць. Падчас другой хвалі COVID-19 асноўным кірункам дзейнасці беларускага Чырвонага Крыжа застанецца падтрымка ў першую чаргу пажылых людзей. Акрамя таго, дапамогу, у тым ліку і грашовую, змогуць атрымаць тыя, хто сутыкнуўся з фінансавымі праблемамі, — шматдзетныя і няпоўныя сем'і, людзі без пэўнага месца жыхарства і тыя, хто выйшаў з месцаў пазбаўлення волі.**

СТАР. 7

# УРАДЖАЙ САБРАЛІ, ТРЭБА ТОЛЬКІ МІР ЗАХАВАЦЬ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прэзідэнт абурыўся, што некаторыя прадаўцы завозяць з Турцыі і Егіпта бульбу, хоць хапае — прычым лепшай — сваёй. Таксама ён паставіў задачу сачыць за вытворчасцю цукру — салодкі прадукт можа дапамагчы паправіць экспартныя паказчыкі, бо запыт на пастаўкі ўжо ёсць ад расіян.

Асаблівая ўвага падчас паездкі аддаецца кукурузе. Пакуль адносна цёплае і ветранае надвор'е, яе трэба збіраць, сушыць і закладваць у «рукавы».



Фота БелТА.

Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Іван Крупко расказаў, што ўжо нарыхтавалі 543 тысячы тон кукурузнага зерня, мяркуецца атрымаць яшчэ 830 тысяч тон. Лічбы адрозніваюцца ў меншы бок ад запланаваных, заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Але спрыяльнае надвор'е дазволіла значна павялічыць нарыхтоўкі сенажоў і сіласу. Прэзідэнт загадаў губернатарам узяць на кантроль якасць кармоў.

Таксама кіраўнік дзяржавы спытаў міністра, ці хопіць сабранага ўраджаю для забеспячэння ўнутраных патрэб краіны. «Таго, што ў нас расце, і па пастаўленых задачах хопіць», — адказаў Іван Крупко. «Галоўная задача, каб за кошт гэтага ўтрымлівалі адпаведныя цэны да будучага ўраджаю», — зноў засярodзіў увагу на цэнах кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнта пачаставалі прадукцыяй Слуцкага сыраробнага камбіната. Як адзначыў яго дырэктар Дзяніс Васько, 70 % вырабаў ідзе на экспарт, большасць — у Расію. У гэты перыяд года, дарэчы, на рынку і цэны, і попыт на сыры павялічваюцца. Расказалі Прэзідэнту пра марожанае, якое робяць з сухіх сумесяў. Такія сумесі пастаўляюць на экспарт. Беларускаму лідару падарылі сыры, якімі — ён запэўніў — падзеліцца з чыноўнікамі.

На малочна-таварным комплексе «Ванькоўшчына» Прэзідэнт пацікавіўся ўмовамі, створанымі для жывёлы. На ферме ўтрымліваюць каля 1000 кароў. Паказалі Аляксандру Рыгоравічу рэканструяваныя цэхі, якія аднавілі за некалькі месяцаў. «Калі ў вас так заўсёды, як сёння, то малайцы. Ведаю, што часам можа быць і горш, але галоўнае, каб жывёле было цёпла і ўтульна. Добрая ферма», — адзначыў Прэзідэнт.

Ён прызнаўся, што яму сорамна перад аграрыямі, што пакуль тыя працуюць, жыхары Мінска «бадзяюцца» па вуліцах. «Мяне насцярожвае, што толькі дзесьці такі душок (пратэсны. — **«Зв».**), пачынаюць пад'язджаць спецыялісты, баевікі з усяго свету. Хтосьці ваюе ў Сірыі, ідзе на смерць дзеля грошай — прафесійныя забойцы. І такія прыязджаюць справакаваць, узарваць абстаноўку. Мы за гэтым сочым, з іншымі мы справімся. Трэба гэта зрабіць акуратна», — сказаў ён.

Перад адлётам Прэзідэнт адказаў на пытанні журналістаў, якія датычыліся вынікаў чарговага сельскагаспадарчага сезона, сітуацыі з «ковідам» у краіне і масавых мерапрыемстваў у сталіцы, запланаваных на выхадныя.

## КОЛЬКІ КРАІНА ЗАРОБІЦЬ НА ЭКСПАРЦЕ СЕЛЬГАСПРАДУКЦЫІ

Адказ на першае пытанне — пра стан аграпрамысловага комплексу напярэдадні зімы — Аляксандр Лукашэнка пачаў з таго, што падкрэсліў: год быў вельмі добры. Сабралі ўжо 8,5 мільёна тон збожжавых, да гэтага можна будзе дадаць яшчэ 1,3 мільёна тон кукурузнага зерня і 800 тысяч тон рапсу.

«Кукуруза крыху нас падвяла, таму што год быў складаны для росту кукурузы. Але мы ніколі такі ўраджай збожжавых не атрымлівалі. Ну і травяністых кармоў, каб скаціну накарміць, — сіласу, сенажу, сена значна больш, чым у мінулым годзе. Таму год вельмі добры, нягледзячы на тое, што ён высакосны, палітычны, «ковідны» год», — сказаў Прэзідэнт, запэўніўшы, што краіна будзе не толькі адзета і накормлена, але і на экспарт прадасць мільярдаў на пяць-шэсць сельгаспрадукцыі.

## НОВЫЯ СЭНСЫ ДЛЯ ІНВЕСТЫЦЫЙНАГА ЦЫКЛА

«Трэба ўкладваць грошы ў будаўніцтва новых прадпрыемстваў. Найперш — высокатэхналагічных, бо будаваць старое бескарысна. На рынку не зможам канкурыраваць і прадаваць прадукцыю, таму неабходна інвеставаць у будаўніцтва новага», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, адказваючы на пытанне пра інвестыцыйныя перспектывы на будучую пяцігодку.

Адно з новых прадпрыемстваў — камбінат па паглыбленай перапрацоўцы цэлюлозы. «Мы будзем ісці глыбей, і на гэтым добра заробім. І мы гэта ўмеем рабіць, таму будзем будаваць новыя прадпрыемствы, і на вёсцы, і на прамысловасці з разлікам на кампетэнцыі нашых людзей», — заявіў Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, асвойваюць беларусы і новыя для сябе тэхналогіі — ствараюць штучныя спадарожнікі для космасу, 7 лістапада мяркуецца адкрыццё АЭС.

«Сэнс гэтага інвестыцыйнага цыклу ў тым, каб пабудаваць новыя тэхналагічныя прадпрыемствы і мадэрнізаваць старыя, паглыбляючы вытворчасць», — патлумачыў Прэзідэнт.

Ён звярнуў увагу, што ў краіне правільна зрабілі, не спыніўшы прамысловасць і АПК падчас пандэміі. «Аграрыі кажуць, 10-15 працэнтаў на складах толькі запасаў, усё са свістам ідзе на экспарт»,— рэзюмаваў кіраўнік краіны.

## З КАРАНАВІРУСАМ ПРЫЙДЗЕЦЦА ЖЫЦЬ

Сярод пытанняў журналістаў — зноў «ковід», рост якога фіксуецца ў свеце.

Прэзідэнт расказаў, што сам перанёс яго на нагах і вельмі стараўся вылечыцца да свайго выступлення з пасланнем. Вопыт, якім ён хоча падзяліцца пасля выздараўлення, — галоўнае, не дапусціць «псіхозу». Ён прызнаўся, што ведаў: большасць насельніцтва ў яго метады барацьбы з пандэміяй не паверыла.

«Я сумленна гэта прызнаю. Страшна было, але я разумеў, што ўся хвароба — у галаве. Фізічна мы перанясём раны, траўмы і іншае. Але калі ты пачынаеш паддавацца псіхозу — усё, — заўважыў Прэзідэнт. — «Ковід» стаў самай страшнай хваробай. Людзі ўжо забыліся пра анкалогію і думалі пра гэты вірус. Гэта няправільна, я гэта адчуваў. Гэта мая інтуіцыя, вопыт. І спрабаваў вам гэта ў галаву ўкласці і дастукацца да вас. Вы мне не паверылі. Але цяпер вы пераканаліся, што я меў рацыю».

Ён нагадаў свой жорсткі выраз, які паўтараў шмат разоў у тыя часы: «Што будзем жраць?» Па яго словах, калі б мы закрылі краіну, то прапусцілі б гэты ўраджайны год.

Прэзідэнт выказаў думку, што з каранавірусам чалавецтву прыйдзецца жыць, як з грыпам ці ВРЗ.

«Будзе вакцына, правакцынуем людзей. Вось Пуцін мне прапанаваў расійскую вакцыну. Я адразу ўзяў 100 доз, у іх саміх не хапае. Пачалі з Галоўчанкі (прэм'ер-міністр. — **«Зв».**). Ён ужо прышчэплены і ў яго з'явіліся антыцелы. Прышчапіў «імем рэвалюцыі» ўсіх сілавікоў», — расказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што шмат людзей хварэе бессімптомна і іх вельмі цяжка адсачыць. А да статыстычных даных трэба ставіцца скептычна яшчэ па адной прычыне: «У нас 650 чалавек за суткі з'яўляецца плюсавых. Я думаю, вялікі рост атрымаўся. Адкрываю даныя, гляджу — мы за суткі праводзім 26 тысяч тэстаў, а вясной праводзілі 10-11 тысяч. А зараз 26 тысяч, канечне, калі больш тэсціруем, больш выяўляем. То-бок пакуль сітуацыя ў нас кантралюемая», — растлумачыў кіраўнік дзяржавы.

Па яго інфармацыі, на ШВЛ усяго ў краіне зараз знаходзіцца да 190 чалавек з цяжкім працяканнем хваробы.

Прэзідэнт прызнаўся, што з-за пандэміі ён не надаў належнай увагі сваёй перадвыбарнай кампаніі.

«Мне не было калі займацца перадвыбарнай кампаніяй, і можна сказаць, што я яе праваліў, бо быў заняты «ковідам», лячэннем хворых. Таму хтосьці і скарыстаўся тым, што я па-наплявацельску да гэтага ставіўся — кампанія пройдзе. Недаацаніліся мы ў гэтым плане», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

## НЕЛЬГА РЫЗЫКАВАЦЬ ЛЮДЗЬМІ

Прэзідэнт расказаў журналістам, як успрымае мітынг у сваю падтрымку, які быў анансаваны ў гэту нядзелю. «Мая пазіцыя адмоўная. Але я вельмі ўдзячны і прафсаюзам, і маладзёжным арганізацыям, і асабліва ветэранам».

Як паведамілі кіраўнік краіны, з усіх раёнаў Беларусі для ўдзелу ў мітынгу ў Мінску ў выхадныя было заяўлена 300 тысяч чалавек, што значна больш, чым можа прыняць сталіца.

«Вось Машэрава—Казлова, уяўляеце, плошча Перамогі з усімі завулкамі, далей Кастрычніцкая плошча, Адміністрацыя Прэзідэнта з усімі завулкамі будуць запоўнены. Далей плошча Незалежнасці, праспект Пераможцаў з усімі прылеглымі вуліцамі. Там размесціцца каля 100 тысяч, ну 110 тысяч, калі вельмі шчыльна. Мы думалі размеркаваць іх на тры пляцоўкі. Ну 50 тысяч размяркуем, але 300—250 тысяч? Гэта ад ГУМа да Стэлы ўсё будзе занята», — сказаў Прэзідэнт. Паводле слоў Прэзідэнта, людзі едуць падтрымаць «Бацьку», а яго (ён планаваў выступіць на Кастрычніцкай плошчы) убачыць толькі невялікая колькасць прысутных.

Ён упэўнены, што такую масу людзей сталіца «не пераварыць». «Гэта будзе калапс. Мы поўнасцю паралізуем Мінск», — дадаў ён, але адзначыў, што праблема не толькі ў гэтым.

«Але галоўнае — мы не забяспечым бяспеку людзей. Мяне насцярожвае інфармацыя — адзін выбух у натоўпе, і людзей пачнуць ціснуць, як на Нямізе, — падкрэсліў кіраўнік краіны. — Ды і «пратэстуны» па вуліцы ходзяць. Мы што, міліцыю зараз забяром для забеспячэння бяспекі? А хто будзе кантраляваць астатнюю частку?»

На такое рашэнне Прэзідэнта паўплываў і рост колькасці хворых на «ковід». «Таму маё меркаванне на сёння — нельга нам збіраць народ. Пераб'ёмся, чаго нам прыпадабняцца да іх, — сказаў Прэзідэнт. — Я вельмі ўдзячны грамадскім аб'яднанням, прафсаюзам, што яны не спалохаліся прапанаваць гэту ініцыятыву, але за 3-4 дні (пакуль гэта ўсё разварочвалася) я прыходжу да высновы, што нам нельга рызыкаваць людзьмі».

Ён выказаўся наконт ультыматума, які аб'явілі пратэстоўцы. «Яны нам аб'явілі ўльтыматум. Людзі выходзьце, зачыняйце заводы. Ну зачыняйце. У нас жа і сярод журналістаў некаторыя хайпанулі, а сёння ўжо просяцца назад. Не, сказаў, будуць працаваць тыя, хто працаваў у гэты час. Так будзе і на заводах. Няўжо яны не ведаюць і не разумеюць, што з нас спрабуюць зрабіць рабоў?» — папярэдзіў Прэзідэнт.

Па яго словах, хваля мітынгаў ад людзей у падтрымку дзеючай улады пайшла пасля апошняй нядзелі, калі адбылася радыкалізацыя пратэсту. Ён нагадаў, што беларусы на постсавецкай прасторы лічацца «непалоханымі», бо нас мінулі ваенныя перавароты падчас станаўлення незалежнасці.

«Хочацца, каб быў спакой і мір. Увесь Мінск устрапянуўся, зразумеў, што мы можам страціць. Гэта добра, што мы без вайны гэта зразумелі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Указ

## Каб больш спажывалі электрычнасці

**Дадатковыя меры для стымулявання выкарыстання насельніцтвам электраэнергіі на ацяпленне, падагрэў вады і гатаванне ежы прадугледжаны Указам Прэзідэнта № 375 ад 22 кастрычніка 2020-га для малазабяспечаных і сацыяльна ўразлівых катэгорый беларусаў.**

Дакумент дае мясцовым органам улады права павялічыць сумы пакрыцця часткі расходаў на правядзенне работ па электразабеспячэнні жылля (за кошт бюджэту) для асобных катэгорый грамадзян з 20 % да 40 %, але не больш за 80 базавых велічынь.

Сёлета з такой жа мэтай 14 красавіка 2020 г. быў падпісаны аналагічны Указ № 127, які прадугледжвае пакрыццё расходаў на 20 %, але ў памеры не больш як 40 базавых велічынь. Дакумент датычыцца аднакватэрных дамоў. Мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі фарміруюцца спісы грамадзян, якія маюць права на пакрыццё расходаў. Каб трапіць у іх, чалавек павінен прадставіць уладам пералік пэўных дакументаў.

Нагадаем, што да работ па электразабеспячэнні адносяцца наступныя. Будаўніцтва, у тым ліку праектаванне, адгалінаванне ад ліній электраперадачы да ўводнага ўстройства дома і (або) унутрыдамавых (унутрыкватэрных) сістэм электразабеспячэння. Набыццё электраэнергетычнага абсталявання і матэрыялаў, якія неабходныя для выкарыстання электраэнергіі на падагрэў вады, ацяпленне і гатаванне ежы: электрычных канвектара, катла, воданагравальніка, пліты, кабелю, каробкі для электраправодкі, а таксама шчытка з прыборам засцерагальнага адключэння і аўтаматычнымі выключальнікамі.

Вярнуць сродкі можна толькі аднойчы і за правядзенне работ у адным доме, нават калі ў чалавека іх ва ўласнасці некалькі.

**Ірына СІДАРОК.**

Блізкая ўлада

# ГАЛОЎНАЕ — ЗАХАЦЕЦЬ

**У адным з двароў Гомеля новая баскетбольная пляцоўка стала прыцягальным месцам для аматараў спорту — дзяцей, падлеткаў і іх бацькоў. Спартыўны аб'ект — вынік агульнага імкнення зрабіць жыццё юных гамяльчан больш актыўным і прывіць любоў да спорту.**



Жылыя дамы №№ 7А і 7Б па вуліцы 8-й Іншагародняй пабудаваныя не так даўно. Засяліліся туды ў асноўным маладыя сем'і, якія маюць дваіх і больш дзяцей. Але спачатку ў двары ўвогуле адсутнічала абсталяванне для гульняў. З ініцыятывай зрабіць дзіцячыя пляцоўкі выступілі самі жыхары. Стварылі ў сецівe групу і кінулі кліч, каб аб'яднаць намаганні. У выніку пры падтрымцы адміністрацыі Чыгуначнага раёна і КЖРЭУП «Сельмашаўскае» месцічы ўладкавалі гульнявую пляцоўку.

Але гэта была тэрыторыя для малодшых дзетак. Старэйшыя дзеці і падлеткі марылі аб сапраўднай баскетбольнай пляцоўцы. З просьбай аб арганізацыі такога аб'екта жыхары дамоў звярнуліся ў Гомельскі аблвыканкам. І не дзіўна, бо пэўны час аматары рухавых спартыўных гульняў вымушаны былі займаць стадыён дзяржаўнага каледжа народных промыслаў, што размешчаны побач з дварамі. Гэта, дарэчы, адзіны такі спартыўны аб'ект ва ўсім мікрараёне.

У адказ на зварот з аблвыканкама мясцовым жыхарам паступіла прапанова таксама прыняць удзел у гэтай справе. За сабраныя сродкі сем'і набылі шчыты і кольцы. Камунальнікі раённай арганізацыі заняліся ўладкаваннем аб'екта. Пляцоўку для гульні ў баскетбол заасфальтавалі работнікі Гомельскага гарадскога дарожна-будаўнічага рамонтнага трэста.

Жыхар дома № 7А, бацька дваіх дзяцей Мікалай Колаш ад імя ўсіх жыхароў накіраваў старшыні аблвыканкама Генадзю Салаўю падзяку за аператыўную дапамогу мясцовых улад.

«Шчыры дзякуй за атрыманне магчымасці нашым дзецям, дзецям з найбліжэйшых дамоў умацоўваць здароўе, атрымліваць зарад бадзёрасці... Абавязуемся на асабістым прыкладзе прывучаць іх да здаровага спосабу жыцця, выхоўваць будучых чэмпіёнаў, захоўваць і памнажаць найлепшыя традыцыі на карысць свайго роднага горада і будучага пакалення», — адзначыў гамяльчанін у сваім звароце.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

Дата

# Больш за 640 тысяч выклікаў за год

## Хуткая дапамога Мінска адзначае юбілей




Фота БелТА.

**Учора хуткая дапамога Мінска адзначыла 110-гадовы юбілей. Больш за сотню ўрачоў, медсясцёр, фельчараў, кіроўцаў атрымалі за сваю важную і патрэбную працу заслужаныя ўзнагароды ад Міністэрства аховы здароўя, камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама і Беларускага прафсаюза работнікаў аховы здароўя.**

Як адзначыў **выконваючы абавязкі міністра аховы здароўя Дзмітрый ПІНЕВІЧ,** высокая кваліфікацыя персаналу дазваляе аператыўна аказваць дапамогу складаным пацыентам.

— Медыкі маюць цэлы шэраг сэрвісаў. Можна зняць кардыяграму, адправіць яе ў экспертны цэнтр і атрымаць у анлайн-рэжыме заключэнне. Можна звязацца са стацыянарам і пры транспарціроўцы пацыента ў крытычным стане адразу атрымаць доступ да спецыялізаванай дапамогі на ўваходзе ва ўстанову аховы здароўя. Досыць шмат такіх элементаў работы, пра якія раней можна было толькі марыць. Ну і, вядома ж, нашы аўтамабілі і кваліфікацыя персаналу дазваляюць дастаўляць пацыентаў на далёкія адлегласці, — падкрэсліў Дзмітрый Піневіч.

Сярод задач, якія кіраўнік галіны паставіў перад службай хуткай дапамогі, — далейшае ўдасканаленне кваліфікацыі медыкаў і перааснашчэнне абсталявання, набору лекавых сродкаў і аўтамабільнага парку.

Паводле слоў **галоўнага ўрача гарадской станцыі хуткай медыцынскай дапамогі Аляксандра ЖЫНКО,** колькасць выклікаў хуткай дапамогі дасягае 640-650 тысяч у год. І на працягу апошніх гадоў гэта лічба не мяняецца.

**Алена КРАВЕЦ.**

Каштоўнасці

# СКАЗАЦЬ ПРА ВАЖНАЕ, НЕ СТРАЦІЎШЫ АЎДЫТОРЫЮ

**Кнігі «Сімвалы Беларусі» і «Я — грамадзянін Рэспублікі Беларусь» — гэта выданні, якія не толькі разлічаны на шырокае кола чытачоў, бо маюць цікавы змест, але і ілюструюць імкненне беларускіх выдавецтваў расказваць пра грунтоўныя рэчы, арыентуючыся на патрабаванні часу і попыт аўдыторыі.**




— Ідэя праекта, вынікам якога стала выданне «Сімвалы Беларусі», узнікла яшчэ зімой падчас кніжнай выстаўкі-кірмашу. Мы размаўлялі з дырэктарам Нацыянальнага гістарычнага музея і сышліся на тым, што хацелі б зрабіць праект пра Беларусь, які раскрываў бы ўсе яе грані. Паказваў бы ўсе нашы адметнасці, але так, каб гэта не было стандартна. І мы прапанавалі канцэпцыю, якую ўхвалілі і падтрымалі ў філіяле Нацыянальнага гістарычнага — у Музеі сучаснай беларускай дзяржаўнасці. Яго супрацоўнікі зразумелі сутнасць нашай задумы: сабраць тыя знакавыя з'явы гісторыі і сучаснасці, якія вызначаюць нашу дзяржаву, якія ўзнікаюць у асацыяцыях, калі мы гаворым пра краіну і наш народ. Пабач і тое, што мы, беларусы, самі пра сябе думаем, і тое, што ўзнікае ва ўяўленні іншых людзей у тым ліку і за мяжой, — тлумачыць канцэпцыю стварэння кнігі **дырэктар выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» Вольга ВАНІНА.**

Складальнікі вырашылі для зручнасці выкласці ўсю інфармацыю ў раздзелы: «Дзяржаўныя сімвалы» (дзе размова ідзе пра герб, сцяг, гімн, а таксама Канстытуцыю, Дэкларацыю незалежнасці і іншае, што характарызуе краіну ў згаданым кантэксце); «Прырода» — апісвае самыя розныя аб'екты, сярод якіх і валошкі, і зубр, і азёры; «Народныя традыцыі і рамёствы» (ручнікі, арнамент, іх значэнне, будова беларускай хаты, беларуская кухня і гэтак далей); «Беларускія класікі» (знаёміць з прадстаўнікамі розных відаў мастацтва); «Праўда памяці» (раздзел, прысвечаны ўвекавечанню тэмы Вялікай Айчыннай вайны) і шэраг іншых. Кніга змяшчае фотаздымкі і інфармацыю па кожным сімвале на трох мовах — беларускай, рускай і англійскай, што дазваляе прэзентаваць для замежных гасцей.

Яшчэ адна кніга з падобным зместам, але крыху ў іншай стылістыцы падачы інфармацыі перавыдадзена ў выдавецтве «Адукацыя і выхаванне» — гэта «Я — грамадзянін Рэспублікі Беларусь». Яе найперш ведаюць і змогуць згадаць тыя юныя беларусы, якія ўжо атрымалі свае першыя пашпарты ў далёкім 2007 годзе. А цяперашняе выданне 2019 года ўжо мае абноўлены выгляд і змест. Перапрацавана з улікам не толькі ўзросту аўдыторыі, на якую разлічана, але і абапіраючыся на лічбавыя тэхналогіі і з мэтай зрабіць яе больш даступнай для сваіх чытачоў, не згубіўшы пры гэтым якаснага зместу.

— Главы нашай кнігі расказваюць і раскрываюць змест асноўных раздзелаў Канстытуцыі нашай краіны, распавядаюць пра дзяржаўную будову і гістарычныя этапы фарміравання дзяржаўнасці. Тут асвятляюцца розныя галіны айчыннай эканомікі, гісторыі, традыцыі. Абмяркоўваюцца пытанні экалогіі, падаткаў, а таксама гаворыцца пра людзей, якія адыгралі ключавую ролю ў станаўленні беларускай дзяржавы. У кнізе шырока выкарыстоўваюцца схемы, інфаграфіка, фотаздымкі, QR-коды і мінімізавана тэкставая інфармацыя, што адпавядае сёння попыту сучасных падлеткаў, — адзначыў на прэзентацыі **намеснік дырэктара выдавецтва «Адукацыя і выхаванне» Віктар ЯКЖЫК.**

Асобна варта сказаць пра тое, што раней гэтая кніга мела дадаткі на кампакт-дысках, а цяпер выпусцілі электронныя дадаткі «Я і закон», які дазваляе азнаёміцца і сарыентавацца ў свеце законаў, і «Шэдэўры культуры», дзе ёсць магчымасць паслухаць творы беларускіх аўтараў і іх біяграфіі. Распрацаваны і спецыяльныя інтэрактыўныя заданні па тэмах. Развіваць электроннае напаўненне выдання плануюць і надалей.

**Алена ДРАПКО.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Удзельнікі канфлікту ў Лівіі дамовіліся аб перамір'і

Дакумент аб шэрагу важных дамоўленасцяў зацверджаны ўдзельнікамі сумеснай лівійскай ваеннай камісіі на перамовах у Жэневе, паведаміла РІА «Навіны». Цырымонія падпісання прайшла ў зале Канферэнцыі па раззбраенні жэнеўскай штаб-кватэры ААН у прысутнасці гендырэктара жэнеўскага офіса Таццяны Валавай і выконваючай абавязкі спецпасланніка ААН па Лівіі кіраўніка місіі ААН па падтрымцы гэтай краіны Стэфані Уільямс. Перагаворы ўдзельнікаў сумеснай лівійскай камісіі ў фармаце «5 + 52» праходзілі з 19 да 23 кастрычніка. Паведамляецца, што сярод дасягнутых дамоўленасцяў — рашэнне аб аднаўленні рэгулярных паветраных зносін паміж Трыпалі і Бенгазі. Акрамя таго, вырашана падтрымліваць спакойную сітуацыю на перадавой і пазбягаць эскалацыі, аказваць садзейнічанне намаганням саветаў старэйшын па абмене палоннымі, працаваць з прадстаўнікамі нацыянальных нафтавых карпарацый, каб аднавіць здабычу сыравіны. Акрамя таго, бакамі выказана згода на адкрыццё сухапутных маршрутаў, якія злучаюць усе рэгіёны і гарады Лівіі.

### ААН прагназуе спад сусветнага гандлю



У ААН прагназуюць спад сусветнага гандлю сёлета з-за росту колькасці выпадкаў каранавіруснай інфекцыі прыблізна на 7-9 працэнтаў у параўнанні з вынікамі мінулага года, адзначаецца ў прагнозе Канферэнцыі ААН па гандлі і развіцці (ЮНКТАД). У сусветным гандлі адзначаны спад на пяць працэнтаў у трэцім квартале ў параўнанні з адпаведным перыядам летась. Спецыялісты адзначаюць, што адносна другога квартала бягучага года, калі спад дасягнуў 19 працэнтаў, гэта добры вынік. Эксперты таксама ўпэўненыя, што ў чацвёртым квартале не атрымаецца пераадолець крызіс у сусветнай камерцыі і паказчыкі будуць на 3 працэнты ніжэй, чым за такі ж перыяд летась. Пры гэтым гандаль прыкметна ажывіўся ў Кітаі, эксперт якога «стабілізаваўся ў другім і моцна вырас у трэцім квартале», паведамляе ЮНКТАД. «У адрозненне ад іншых буйных эканомік, кітайскі імпарт стабілізаваўся ў ліпені і жніўні і вырас на 13 працэнтаў у верасні», — адзначаецца ў дакладзе. Больш за іншыя тавары вырас гандаль медыцынскімі матэрыяламі, якія маюць дачыненне да барацьбы з каранавірусам.

### У арганізме чалавека знайшлі яшчэ адзін орган

Супрацоўнікі Нідэрландскага інстытута раку выявілі орган чалавечага арганізма, які раней не быў апісаны ні ў адной навуковай працы, перадае «Бі-бі-сі». У матэрыяле часопіса Radiotherapy and Oncology адзначаецца, што даследчыкі працавалі з пацыентамі з выкарыстаннем пазітронна-эмісійнай і камп'ютарнай тамаграфіі. Каб распазнаць пухліны, яны ўводзілі ў чалавечы арганізм пазначаную радыеактыўнымі ізатопамі глюкозу. Падкрэсліваецца, што вынікам такіх абследаванняў стала выяўленне на здымках чацвёртай пары слінных залоз — яны рэагавалі на рэчыва, якое ўводзілася навукоўцамі. «Дадатковыя» залозы заўважылі ва ўсіх пацыентаў, якіх правяралі пры дапамозе спецыяльнага сканера. Да гэтага было вядома аб наяўнасці ў чалавека ўсяго трох буйных пар слінных залоз. Аднак яшчэ адна — дадатковая, чацвёртая — пара залоз знаходзіцца практычна ў цэнтры галавы. Магчыма, раней яе маглі проста не заўважыць з-за нязручнага для разгляду размяшчэння, мяркуюць эксперты.

ПЛАЦДАРМ
Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь
Выпуск № 8 (107)

**Сённяшні стан беларускай арміі і перспектыўныя кірункі яе развіцця былі абмеркаваны на адмысловым семінары ў Брэсце. Сустрэча з удзелам кіраўніцтва Міністэрства абароны краіны адбылася на базе 38-й асобнай дэсантна-штурмавой брыгады. Легендарнае элітнае падраздзяленне ўваходзіць у склад сіл спецыяльных аперацый Узброеных Сіл краіны і лічыцца адным з найлепшых. Яно здольнае выконваць задачы па прызначэнні ў любых умовах становішча, у тым ліку пры ўдзеле ў контртэрарыстычных мерапрыемствах. Перад афіцэрамі і журналістамі выступіў міністр абароны Віктар ХРЭНІН. Ён закрануў шмат аспектаў дзейнасці беларускай арміі.**



# Ваенны спецназ працуе ціха



## ВАЕННА-ПРАМЫСЛОВЫ КОМПЛЕКС: ЗАДАЧЫ НА БУДУЧЫНЮ

Канцэпцыя будаўніцтва і развіцця Узброеных Сіл да 2030 года ставіць на мэце захаванне і нарошчванне існуючага патэнцыялу войскаў.

Адна з важных задач — развіццё сістэмы тэхнічнага забеспячэння. Па-ранейшаму будуць закупляцца не проста новыя, а перспектыўныя комплексы і сістэмы ўзбраення, ваеннай і спецыяльнай тэхнікі.

— Такім чынам, у ваенна-паветраныя сілы і войскі супрацьпаветранай абароны працягнуць паступаць сучасныя самалёты Су-30СМ і верталёты Мі-35, — адзначыў Віктар Хрэнін. — Таксама запланаваны пастаўкі радыёлакацыйных станцый «Праціўнік», «Сопка», «Усход», «Небасхіл», комплекс «Раса-РБ(М)», зенітны ракетны комплекс «Тор-М2». Сучаснае тэлекамунікацыйнае абсталяванне прыйшло амаль на ўсе вузлы сувязі. Дзякуючы ваенна-тэхнічнаму супрацоўніцтву з іншымі краінамі нашы войскі аснашчаюцца сучаснай бранятанкавай і авіяцыйнай тэхнікай, зенітным ракетным і стралковым узбраеннем, — заявіў Віктар Хрэнін.

У першую чаргу гэта датычыцца ўзаемаадносін з Расіяй і Кітаем. Калі з Паднябеснай да нас паступаюць лёгкабраніраваныя аўтамабілі павышанай праходнасці «Дракон» і «Асілак», то з Расіі — танкі Т-72Б3, самалёты Су-30СМ і Як-130, верталёты Мі-8МТВ5 і комплексы «Тор-М2».

Тыя ўзоры тэхнікі, якія выкарыстоўваюцца цяпер, пройдуць мадэрнізацыю. Але толькі калі яны валодаюць пэўным патэнцыялам для гэтага.

— Айчынныя прадпрыемствы наладзілі капітальны рамонт і мадэрнізацыю разнастайных узораў узбраення, ваеннай і спецыяльнай тэхнікі, — заявіў міністр абароны. — За апошнія пяць гадоў у Беларусі было капітальна адрамантавана больш за 160 і мадэрнізавана больш за 100 адзінак тэхнікі. Сярод іх — бронетранспарцёры БТР-70, танкі Т-72Б.

Акрамя таго, у арміі зараз вядзецца работа, накіраваная на тое, каб скарачыць лішкі запасаў тэхнікі і боепрыпасаў.

— Іх колькасць з 2015 года ўпала ў шэсць разоў. А дзякуючы рэалізацыі прадукцыі ваеннага прызначэння ў бюджэт краіны паступіла больш за 250 мільёнаў долараў.

## ВАЕННАЯ АДУКАЦЫЯ ПАШЫРЫЦЦА

Навацыі закрануць і падрыхтоўку афіцэраў у вышэйшых навучальных установах Беларусі. Так, ваенна-медыцынскі факультэт, які зараз працуе ў складзе Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, будзе рэарганізаваны ў ваенна-медыцынскі інстытут. У сваю чаргу, на яго базе мяркуецца стварыць цэнтр тактычнай медыцыны. Гэтыя захады дазволяць арганізаваць сертыфікаваную падрыхтоўку спецыялістаў, якія, апроч іншага, будуць умець аказваць першую медыцынскую дапамогу ў асаблівых умовах.

— Плануецца таксама адкрыць дзве новыя ваенныя кафедры. Яны будуць дзейнічаць на базе Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага і Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэтаў. Дзякуючы гэтаму штогод будзе выпускацца да 400 афіцэраў запасу.



Міністэрства абароны прапаноўвае ўвесці ў школах і сярэдне-спецыяльных навучальных установах краіны ваенна-патрыятычнае аб'яднанне па інтарэсах (клуб) «Абаронца Айчыны».

Як расказаў Віктар Хрэнін, мяркуецца, што гэтае аб'яднанне будзе дзейнічаць па прынцыпе добраахвотнасці як пазакласныя заняткі. Для арганізацыі і правядзення ваенна-патрыятычных мерапрыемстваў прапануецца разгледзець пытанне аб стварэнні спадарожных праграм для смартфонаў і камп'ютарных праграм для віктарын, гістарычных экскурсаў, квэстаў і гульняў. Дапамогуць у гэтым вайскоўцы роты інфармацыйных тэхналогій.

— У самой назве «Абаронца Айчыны» закладзены сэнс таго, што маецца на ўвазе не выключна чалавек са зброяй у руках. Гэтае паняцце куды больш шырокае. Абаронца краіны — не толькі вайсковец, але і педагог, і ўрач, і чалавек іншай спецыяльнасці. Галоўнае, каб ён быў патрыётам, — мяркуе міністр.

## БОЛЬШ ВОЛЬНАГА ЧАСУ?

Вайскоўцам і тым, хто прайшоў тэрміновую службу, плануюць прапанаваць дадатковыя льготы.

— У вайскоўцаў тэрміновай службы можа з'явіцца больш звальненняў і, як вынік, дадатковы вольны час. Таксама можа павялічыцца іх грашовае забеспячэнне. Зараз гэтыя пытанні прапрацоўваюцца, — паведаміў Віктар Хрэнін.

Кіраўнік ваеннага ведамства таксама адзначыў, што і надалей будуць рабіцца захады, накіраваныя на павелічэнне прэстыжу ваеннай службы. Увагу акцэнтуюць на тым, каб вайскоўцы і тыя, хто адслужыў у арміі па прызыве, атрымлівалі больш сацыяльна значных гарантый і льгот. Апошнія мяркуецца распаўсюдзіць на сферы адукацыі, жыллёвага і медыцынскага забеспячэння.

## КІНО ДА 105-ГОДДЗЯ

Як адзначыў Віктар Хрэнін, Міністэрства абароны сумесна з Міністэрствам культуры і кінастудыяй «Беларусьфільм» плануе стварыць тэлевізійны серыял і мастацкі фільм на ваенную тэматыку. Яны будуць прымеркаваны да 105-годдзя Узброеных Сіл. Мэта праекта — заахвоціць маладых людзей да тэрміновай ваеннай службы. Таксама пройдуць спартыўна-патрыятычныя і рэспубліканскія ваенна-патрыятычныя гульні на прызы міністра абароны «Абаронца Айчыны».

***

Семінар уключаў у сябе дзве часткі. Тэорыя змянілася практыкай. Высокі клас падрыхтоўкі паказалі вайскоўцы тэрміновай службы. Гасцям 38-й асобнай дэсантна-штурмавой брыгады паказалі лінейку зброі, якой карыстаюцца ваенныя спецназаўцы. Убачыць штосьці падобнае ўжывую, а не на экране — вялікая ўдача. Вінтарэзы і снайперскія вінтоўкі саступілі месца прыладам, якімі карыстаюцца падраздзяленні радыяцыйнай, хімічнай і біялагічнай абароны. Ваенных спецназаўцаў вучаць карыстацца газасігналізатарамі, гадзіннікам-дазіметрам, камплектамі дэгазацыі, кумулятыўнымі зарадамі. Канешне ж, адным з галоўных экспанатаў стала дэсантная амуніцыя — парашуты, снайперскія кантэйнеры, лодкі і нават платформы, на якіх з вышыні ў некалькі кіламетраў спускаецца каштоўны груз. Камандуючы сіламі спецыяльных аперацый Вадзім Дзенісенка адзначыў, што многія гэтыя ўзоры былі ўпершыню апрабаваныя яшчэ ў Афганістане, але і дагэтуль застаюцца актуальнымі. Асобна ён спыніўся на новай форме, на якую нядаўна перайшлі байцы.

— Яе асаблівасць у максімальнай камфортнасці. Форма пашыта з матэрыялу, які «дыхае». Гэта значыць, узімку ў ёй цёпла, а ўлетку — не так горача, як было раней.

Часць незвычайная яшчэ і ў архітэктурным плане. Як расказаў Вадзім Дзенісенка, амаль усе яе карпусы былі ўзведзены яшчэ «за польскім часам», незадоўга да пачатку Другой сусветнай вайны. Для будаўнічых работ былі запрошаны спецыялісты ажно з Вялікабрытаніі.

Таксама ў распараджэнні спецназаўцаў — унікальны для Узброеных Сіл перасоўны палявы храм.

— Зараз у брыгадзе служаць як праваслаўныя, так і каталікі. І для абедзвюх канфесій прадугледжаны розныя бакі храма. Храм асвечаны ў гонар прарока Ільі, заступніка нашых войскаў. Ікона, якая знаходзіцца каля алтара, паходзіць з XVI стагоддзя.

Практычная частка мерапрыемства працягнулася на палігоне. І калі звычайна карэспандэнты знаходзяцца на вучэннях сярод назіральнікаў, то тут яны самі маглі пастраляць пад кіраўніцтвам спецыяльных інструктараў. У іх распараджэнні аказалася шырокая лінейка зброі — ад пісталетаў і ажно да гаўбіцы. І, канешне ж, класіка — снайперскія вінтоўкі.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота БелТА.**

Беларусь памятае

# «МУЖНЫ КАМАНДЗІР ПЯХОТЫ»

## Першы камдзіў, які атрымаў Зорку Героя, заслужыў яе, абараняючы Барысаў

**У пачатковы перыяд Вялікай Айчыннай вайны зацятыя баі разгарнуліся пры абароне Барысава — старадаўняга беларускага горада на Бярэзіне. Сярод герояў бітвы на беларускай зямлі ў чэрвені 1941 года — генерал Якаў Рыгоравіч Крэйзер. 4 лістапада 2020 года спаўняецца 115 гадоў з дня яго нараджэння.**



Маршал Савецкага Саюза Георгій Жукаў у мемуарах «Успаміны і разважанні» адзначаў: «На рацэ Бярэзіна нашы войскі асабліва ўпарта біліся ў раёне горада Барысава, дзе змагалася Барысаўскае танкавае вучылішча, якім кіраваў дывізіённы камісар І. З. Сусайкоў. Да гэтага часу туды падышла 1-я Маскоўская мотастралковая дывізія пад камандаваннем генерал-маёра Я. Р. Крэйзера. Генералу Крэйзеру, які падпарадкаваў сабе Барысаўскае танкавае вучылішча, удалося затрымаць узмоцненую 18-ю танкавую дывізію праціўніка больш чым на двое сутак. Гэта тады мела важнае значэнне. У гэтых бітвах генерал Я. Р. Крэйзер бліскуча паказаў сябе».

Якаў Крэйзер нарадзіўся ў Варонежы ў небагатай сям'і дробнага гандляра. Адукацыю атрымаў у класічнай гімназіі. У гады Грамадзянскай вайны 17-гадовы юнак паступіў добраахвотнікам у Чырвоную Армію, у 1923 годзе скончыў 22-ю Варонежскую пяхотную школу, у 1931 годзе — Вышэйшую тактычна-стралковую школу каманднага саставу рабоча-сялянскай Чырвонай Арміі — курсы «Стрэл». З 1927 года, з моманту фарміравання ў сталічным гарнізоне дывізіі, якая атрымала назву Маскоўскай Пралетарскай стралковай, і да пачатку Вялікай Айчыннай вайны Якаў Крэйзер служыў у гэтым злучэнні. 1-ю Маскоўскую мотастралковую дывізію даваенных гадоў можна без перабольшання называць своеасаблівай палявой акадэміяй РСЧА. З 1930 года дывізія была пераведзена на кадравую аснову, цалкам укамплектаваная асабовым складам і займалася інтэнсіўнай баявой падрыхтоўкай. Яна ўдзельнічала ў мностве эксперыментальных вучэнняў, адной з першых асвойвала новую па тых часах тэхніку — галоўным чынам на вучэбных палях у раёне Алабіна. Там і мужнеў, набіраўся вопыту Якаў Крэйзер.

16 жніўня 1936 года ў газетах была апублікавана Пастанова ЦВК СССР аб узнагароджанні ордэнамі шэрагу выдатнікаў баявой і палітычнай падрыхтоўкі РСЧА. Камандзір вучэбнага батальёна маёр Якаў Крэйзер быў прадстаўлены да найвышэйшай узнагароды — ордэна Леніна. У 1941 годзе ён скончыў курсы ўдасканалення вышэйшага начальніцкага саставу пры Ваеннай акадэміі імя М. В. Фрунзэ.

У сакавіку — жніўні 1941 года Якаў Крэйзер камандаваў 1-й Маскоўскай мотастралковай дывізіяй 20-й арміі. Да пачатку вайны дывізія ўяўляла сабой добра падрыхтаванае і забяспечанае ў баявым плане злучэнне. Колькасны склад дывізіі — да 12 тысяч чалавек.

«Ваенна-гістарычны часопіс» у № 6 за 1966 год апублікаваў фундаментальны артыкул генерала Якава Крэйзера «У баях паміж Бярэзінай і Дняпром». Вось як апісвае камдзіў вестку пра пачатак Вялікай Айчыннай вайны. «Па-баявому, коратка і ўсхвалявана гучалі на палкавых мітынгах выступленні камандзіраў, палітработнікаў, байцоў. Настрой ва ўсіх адзін — упэўненасць у перамозе над ворагам, хутчэй на фронт, хутчэй біць фашыстаў! 22 і 23 чэрвеня 1-я Маскоўская мотастралковая дывізія, якая папоўнілася да штату ваеннага часу асабовым складам і баявой тэхнікай, атрымала першы баявы загад. Дывізіі ставілася задача: здзейсніць марш па маршруце Масква — Вязьма — Смаленск — Барысаў, а затым заняць абарону на рубяжы ракі Бярэзіна і не дапусціць прарыву нямецка-фашысцкіх войскаў у напрамку Барысаў, Орша».





У тыя дні многія злучэнні Заходняга фронту, прабіваючыся з акружэння, адыходзілі за Бярэзіну; утрыманне горада і асабліва пераправаў на рацэ набывала важнае аператыўнае значэнне. Выкананне гэтых задач дазваляла захаваць жывую сілу і выйграць час для разгортвання на Дняпры рэзерваў, якія рухаліся з глыбіні краіны. У баях Якаў Крэйзер забяспечыў вядзенне паспяховых баявых дзеянняў на галоўным напрамку арміі. Масавы гераізм, незвычайную стойкасць і жалезную вытрымку праявілі воіны ў гэтыя цяжкія дні. У кнізе «Чырванасцяжная Беларуская ваенная акруга» прыводзіцца такі прыклад. Камандзір узвода малодшы лейтэнант Ягор Мінін, атрымаўшы дазвол на адыход з пазіцыі, працягваў абараняць мост праз раку Бярэзіна, пакуль не загінуў. Тут, у баях у раёне Барысава, мужна змагаўся лейтэнант Рубэн Ібаруры, сын вядомай іспанскай інтэрнацыяналісткі Далорэс Ібаруры. Ён быў камандзірам кулямётнага ўзвода 175-га мотастралковага палка. Адбіваючы атаку праціўніка, яго кулямётчыкі нанеслі вялікі ўрон фашыстам. А калі гітлераўцы знішчылі апошні кулямёт, Рубэн з групай кулямётчыкаў, што засталіся ў жывых, узброіўшыся гранатамі, кінуўся на фашысцкія танкі. У гэтай сутычцы Рубэн быў цяжка паранены. За адвагу і гераізм у баях на Бярэзіне ў ліпені 1941 года ён быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

Нягледзячы на геаічныя намаганні нашых воінаў, вытрымліваць націск фашысцкіх танкаў і амаль беспerapынныя налёты авіяцыі праціўніка, якая панавала ў паветры, станавілася ўсё цяжэй. Да канца дня 3 ліпеня 1941 года гітлераўцам удалося пашырыць плацдарм у раёне Стара-Барысава і развіць поспех уздоўж аўтамагістралі Масква—Мінск. Каб затрымаць далейшае прасоўванне ворага, палкоўнік Якаў Крэйзер вырашыў сіламі танкавага і мотастралковага палкоў контратакаваць групу праціўніка, якая прарвалася ўздоўж аўтамагістралі.

Падчас гэтага разгарэўся буйны танкавы бой, з абодвух бакоў у ім удзельнічала звыш 300 танкаў. У выніку контратакі ўдалося затрымаць наступленне ворага да вечара 4 ліпеня.

Для барацьбы з танкамі, якія прарваліся на ўчастку 175-га мотастралковага палка, шырока выкарыстоўваліся бутэлькі з гаручай сумессю. Так, увесь батальён старшага лейтэнанта А. С. Шчаглова быў перакінуты з Чарняўскай пераправы да аўтастрады. Гэтаму батальёну, які ўпершыню ў дывізіі выкарыстаў бутэлькі з гаручай сумессю, удалося падпаліць да пятнаццаці танкаў і затрымаць іх прасоўванне. За праяўлены ў баі гераізм старшы лейтэнант Шчаглоў быў узнагароджаны ордэнам Леніна.



Па ўспамінах Якава Крэйзера, у выніку баёў у раёне Барысава ворагу быў нанесены немалы ўрон у жывой сіле і ў тэхніцы (за тры дні праціўнік страціў да 60-70 танкаў і да 2-3 тысяч салдат і афіцэраў). Контратака дапамагла прыпыніць наступленне ворага на цэлыя суткі. Адыходзячы затым у напрамку Оршы, 1-я Маскоўская мотастралковая дывізія, група І. З. Сусайкова і частка сіл 13-й арміі Заходняга фронту ўпартай абаронай і контратакамі вымотвалі наступаючыя нямецкія злучэнні.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 22 ліпеня 1941 года палкоўніку Крэйзеру Якаву Рыгоравічу прысвоена званне Героя Савецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна і медаля «Залатая Зорка». Ва ўказе адзначалася, што ў цяжкіх бітвах палкоўнік Крэйзер «умела і рашуча кіраваў баявымі аперацыямі дывізіі. Забяспечваў паспяховыя баі на галоўным кірунку арміі. Сваім асабістым удзелам, бясстрашнасцю і геройствам уцягваў у бой падраздзяленні дывізіі». Яму першаму з камандзіраў дывізій Чырвонай Арміі было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Газета «Красная звезда» ў перадавым артыкуле ад 23 ліпеня 1941 года пісала, што «Крэйзер Я. Р. — першы з мужных камандзіраў пяхоты — удастоены высокай узнагароды за адвагу і геройства, праяўленыя на фронце барацьбы з фашызмам, умела кіраваў боем злучэння, натхняў асабістым прыкладам сваіх падначаленых, быў паранены, але не сышоў з поля бою».

У гэты першы, самы цяжкі перыяд вайны, імя Крэйзера ў колах радавых чырвонаармейцаў і малодшых камандзіраў стала сапраўдным сімвалам першых перамог над акупантамі.

У ліпені 1941 года Якаў Крэйзер вывеў сваю дывізію з акружэння і прыняў удзел у Смаленскай абарончай бітве. 7 жніўня ён атрымаў воінскае званне генерал-маёра, у жніўні—снежні 1941-га — стаў камандаваць 3-й арміяй Бранскага, затым Паўднёва-Заходняга франтоў, на чале якой удзельнічаў у Смаленскай бітве і ў Маскоўскай абарончай аперацыі, а таксама ў пачатку контрнаступлення савецкіх войскаў пад Масквой. Ваяваў на Заходнім, Бранскім, Паўднёва-Заходнім, Сталінградскім, Паўднёвым, 4-м Украінскім, Ленінградскім, 1-м і 2-м Прыбалтыйскіх франтах. Удзельнік многіх паспяховых наступальных аперацый, баёў за вызваленне Данбаса, на Перакопскім перашыйку, за авалоданне гарадамі Новачаркаск, Мелітопаль, Сімферопаль, Севастопаль, Шаўляй, Елгава.

У ліпені 1944-га пад камандаваннем генерала Крэйзера войскі 51-й арміі ўдзельнічалі ў баявых дзеяннях у раёне Полацка Віцебскай вобласці ў Беларускай стратэгічнай наступальнай аперацыі «Баграціён».

Камандуючы 1-га Прыбалтыйскага фронту Іван Баграмян у мемуарах «Так ішлі мы да перамогі» пісаў: «Крэйзер з першых дзён вайны знаходзіўся ў баях, камандуючы рознымі агульнавайсковымі аб'яднаннямі. 51-ю армію, якая перадавалася нам з рэзерву Стаўкі, Крэйзер узначальваў ужо амаль год і заслужана лічыўся адным з самых вопытных і правераных у баях камандармаў. Мне ён вельмі падабаўся сваёй настойлівасцю ў дасягненні мэты, аптымізмам і ўменнем хутка арыентавацца ў складанай абстаноўцы».

Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны Якаў Крэйзер камандаваў 45-й і 7-й гвардзейскімі арміямі Закаўказскай ваеннай акругі. У красавіку 1949 года скончыў Вышэйшыя акадэмічныя курсы пры Ваеннай акадэміі імя К. Я. Варашылава. Паслядоўна камандаваў войскамі Паўднёва-Уральскага, Забайкальскага, Уральскага, Далёкаўсходняга ваенных акруг.

У красавіку 1962 года яму прысвоена званне генерала арміі. З лістапада 1963-га да мая 1969 года ўзначальваў Цэнтральныя афіцэрскія курсы «Стрэл». З мая 1969 года — ваенны інспектар-дарадца Групы генеральных інспектараў Міністэрства абароны СССР.

Якаў Крэйзер памёр 29 лістапада 1969 года. Пахаваны на Навадзявочых могілках у Маскве.

**Мікалай ШАЎЧЭНКА.**

БАНК РЕШЕНИЕ

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
## на 1 октября 2020 г.

Наименование банка: ЗАО «Банк «Решение»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2020 | 01.01.2020 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 5 816 | 7 748 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 12 908 | 15 300 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 11 871 | 16 949 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 28 134 | 21 915 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 144 197 | 127 225 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 460 | 460 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 20 231 | 19 415 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | 819 | 541 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 1 712 | 1 712 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | 179 | 179 |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 5 584 | 6 419 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 231 911 | 217 863 |
| 16 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 9 581 | 9 307 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 151 825 | 145 077 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 15 714 | 10 030 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 2 038 | 2 409 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 179 158 | 166 823 |
| 25 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 35 988 | 35 988 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 719 | 406 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 12 938 | 12 978 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 3 108 | 1 668 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 52 753 | 51 040 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 231 911 | 217 863 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
## на 1 октября 2020 г.

Наименование банка ЗАО «Банк «Решение»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2020 | 01.10.2019 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 13 215 | 10 372 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 6 041 | 4 559 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 7 174 | 5 813 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 7 848 | 5 774 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 2 832 | 1 952 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 5 016 | 3 822 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (82) | (1) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 1 853 | 1 355 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | (37) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 3 197 | 1 348 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 1 041 | 1 128 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 9 315 | 9 476 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 442 | 390 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 2 048 | 866 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 335 | 146 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 1 713 | 720 |

Председатель Правления С.Д.Будников

Главный бухгалтер В.С.Боричевская

Дата подписания: 05 октября 2020 г.

ЗАО «Банк «Решение» УНП 100789114. Лиц. № 14 от 08.06.2016 НБ РБ

# ДЕЩЕНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ УЗДЕНСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ

**25 ноября 2020 года по адресу: аг. Дещенка, ул. Школьная, 5А, кабинет председателя (2-й этаж, кабинет № 1) в 10.00**

**проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

| № лота | Продавец | Местонахождение участка | S (га) | Кадастровый номер | Начальная цена, руб. | Расходы по подготовке, руб. | Примечание |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Дещенский сельисполком | д. Володьки, ул. Строителей, уч. 5 и расположенное на нем не завершенное строительством незаконсервированное капитальное строение (фундамент) | 0,1495 | 625680202201000156 | 15 000,00, из них – земельный участок – 10 172,31, фундамент – 4 827,69 | 0 + расходы на публикацию | имеется возможность подключения к водоснабжению, электроснабжению, газоснабжению, проектирование объектов транспортной инфраструктуры подлежит возмещению |
| Лот № 2 | Дещенский сельисполком | д. Дегтяное, ул. Восточная, уч. 1А | 0,1169 | 625680204301000116 | 10 000,00 | 1 471,96 + расходы на публикацию | имеется возможность подключения к водоснабжению, электроснабжению, газоснабжению |
| Лот № 3 | Дещенский сельисполком | д. Колодино, ул. Колодинская, уч. 23 | 0,1500 | 625680206401000041 | 5 000,00 | 76,50 + расходы на публикацию | имеется возможность подключения к электроснабжению |
| Лот № 4 | Дещенский сельисполком | д. Колодино, ул. Колодинская, уч. 31А | 0,1000 | 625680206401000040 | 4 500,00 | 76,50 + расходы на публикацию | имеется возможность подключения к электроснабжению |
| Лот № 5 | Дещенский сельисполком | д. Кашканы, ул. Кашкановская, уч. 1А | 0,2500 | 625683804101000009 | 7 000,00 | 0 + расходы на публикацию | имеется возможность подключения к электроснабжению |
| Лот № 6 | Дещенский сельисполком | д. Рыбаковщина, ул. Рыбаковщинская, уч. 20А | 0,1033 | 625680211701000042 | 5 000,00 | 1 657,08 + расходы на публикацию | имеется возможность подключения к газоснабжению, электроснабжению |
| Лот № 7 | Дещенский сельисполком | д. Русаково, ул. Русаковская, уч. 2 | 0,1000 | 625680211501000031 | 5 000,00 | 0 + расходы на публикацию | имеется возможность подключения к электроснабжению |

Целевое назначение участков – для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов.

Задаток в размере **10 процентов от начальной цены** земельного участка перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на счет № BY47AKBB36410625001146000000 Дещенского сельского исполнительного комитета в ЦБУ № 625 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Узда, МФО AKBBBY2X, УНП 601068832. Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: аг. Дещенка, ул. Школьная, 5А, кабинет управляющего делами (2-й этаж), с 8.00 до 17.00 по рабочим дням по **20 ноября 2020 года** включительно.

Участники аукциона должны представить следующие документы:

• заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

• заверенный банком документ об оплате задатка;

• копию документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

• представителем гражданина – нотариально заверенную доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан представляют документ, удостоверяющий личность.

Заключительная регистрация – с 9.30 до 9.45 в день проведения аукциона.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников. В случае если участник один, аукцион признается несостоявшимся и комиссия имеет право принять решение о продаже единственному участнику аукциона земельного участка в размере его начальной цены, увеличенной на 5 процентов (с согласия участника).

Оплата победителем за предмет аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Победителю за предмет аукциона необходимо произвести возмещение фактических расходов по организации и проведению аукциона и подготовке документации для его проведения.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для продажи на аукционе, путем самостоятельного выезда к месту нахождения этих участков.

Более подробная информация об аукционах, условиях участия размещена на официальном сайте Узденского районного исполнительного комитета: info@uzda.gov.by, либо по телефонам: 8 (01718) 35135, 35149.

## ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению ОАО «8 Марта» (продавец) извещает о проведении 25 ноября 2020 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

| № лота | Наименование имущества | Начальная цена продажи с НДС 20 %, бел. руб. | Задаток (5 %) с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Объекты недвижимости, расположенные на земельном участке с кадастровым номером 340100000001001365 общей площадью 1,0438 га:<br>- изолированное помещение с инв. № 350/D-352976, общей площадью 1316,4 кв. м, назначение – производственное помещение, наименование – красильно-отделочный корпус, расположенный по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 41 Б-5а;<br>- изолированное помещение с инв. № 350/D-347210, общей площадью 1012,5 кв. м, назначение – производственное помещение, наименование – красильно-отделочный корпус (1-й этаж), расположенный по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 41 Б-1;<br>- изолированное помещение с инв. № 350/D-347209, общей площадью 677,9 кв. м, назначение – производственное помещение, наименование – красильно-отделочный корпус (1-й этаж), расположенный по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 41 Б-1а;<br>- изолированное помещение с инв. № 350/D-346241, общей площадью 1008,5 кв. м, назначение – производственное помещение, наименование – красильно-отделочный корпус (2-й этаж), расположенный по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 41 Б-2;<br>- изолированное помещение с инв. № 350/D-346243, общей площадью 833,6 кв. м, назначение – производственное помещение, наименование – красильно-отделочный корпус (2-й этаж), расположенный по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 41 Б-2а;<br>- изолированное помещение с инв. № 350/D-2775, общей площадью 788,9 кв. м, назначение – складское помещение, наименование – красильно-отделочный корпус (подвал), расположенный по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 41-3 | **3 023 433,07** | **151 171,65** |

**Продавец: ОАО «8 Марта»,** г. Гомель, ул. Советская, 41.

Контактные телефоны: +375 232 34-38-99, +375 44 786-50-56.

Дополнительные сведения: дополнительно предлагается в аренду – капитальное строение с инв. № 350/С-161150, общей площадью 118,0 кв. м, назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – сооружение неустановленного назначения (навес), расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 41, с прилегающим земельным участком общей площадью 620 м. кв,

**Шаг аукциона – 5 %.** **Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца BY82BLBB30120400078265001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской обл., г. Гомель, ул. Советская, 7, БИК BLBBBY2X, УНП 400078265.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни **с 10.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения. Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 23.11.2020 г. в 17.00. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.**

**Для участия в аукционе представляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем (далее ИП) Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юр. лица или ИП, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным ИП – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или ИП Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или ИП – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юр. лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять)%. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается Продавцом в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения торгов. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **20 (двадцати)** календарных дней с момента подписания протокола; оплата должна быть произведена продавцу по условиям договора купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62 и на сайте www.deloocenka.by**

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09.

Продавец: **ООО «Главтрансстрой»** (УНП 191903970) в лице управляющего по делу о банкротстве ЧУП «Гетман и Партнеры», тел. 8-017-374-14-35.

Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **09 ноября 2020 г. в 10.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27

| № п/п | Наименование, местонахождение | Начальная цена, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение (инв. № 342/С-57250), общая площадь 125,0 кв. м. Здание административно-бытового корпуса | 16 480,00 |
| 2 | Капитальное строение (инв. № 342/С-57247), общая площадь 636,0 кв. м. Здание механическое мастерской (цеха) | 49 760,00 |
| 3 | Капитальное строение (инв. № 342/С-57225), общая площадь 711,0 кв. м. Здание авторемонтной мастерской с бытовым корпусом | 59 040,00 |
| 4 | Грузовой седельный тягач RENAULT PREMIUM ЛАНДЕР 460.19T, 2009 г. в., VF624GPA000033087 | 27 520,00 |
| 5 | Полуприцеп самосвал OVIBOS, рег. № А 6630 А-3, 2007 г. в., SZ936W1S307TU1007 | 22 640,00 |
| **Местонахождение – Гомельская обл., Светлогорский р-н, г. Светлогорск, ул. Заводская, д. 11** | | |

Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 26.10.2020 г. 09.00 по 06.11.2020 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY, 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 01.09.2020 г.

# АБ'ЯДНАННЕ НЕРАЎНАДУШНЫХ

## Больш за 1,8 тысячы валанцёраў і 52 тысячы даставак

— Падчас першай хвалі каранавіруснай інфекцыі мы вызначылі прыярытэтныя кірункі, па якіх была перафарміравана наша работа. Першы з іх — забеспячэнне ўстойлівай работы нашай медыка-сацыяльнай службы «Дапамога», — расказвае **спецыяліст па навучанні Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Алена РУСІНОВІЧ.** — Пад апекай 147 медыцынскіх сясцёр і 17 малодшых сясцёр міласэрнасці знаходзіцца каля 1,5 тысячы падапечных. Гэта пажылыя людзі, якія ўвесь час дома, яны маюць патрэбу ў пастаянным кваліфікаваным доглядзе. Таму важна было захаваць здароўе медсясцёр. Былі закуплены сродкі індывідуальнай аховы — як для персаналу, так і для падапечных. Даводзілася шмат тлумачыць пажылым людзям, што цяпер да іх не будуць прыходзіць пажылыя валанцёры, як гэта было раней. Замест гэтага яны тэлефанавалі нашым падапечным і такім чынам аказвалі псіхасацыяльную падтрымку. Гэта было вельмі значна для людзей, якія застаюцца адны.

Дарэчы, пандэмія стала выклікам і для саміх пажылых валанцёраў, якіх нямала ў шэрагах Чырвонага Крыжа. Як заставацца валанцёрам, знаходзячыся дома? Яны знаходзілі выйсце — запісвалі міні-ролікі пра фізічную актыўнасць, тэлефанавалі не толькі падапечным, але і сваім пажылым суседзям і знаёмым, дзяліліся інфармацыяй і пераконвалі ў неабходнасці пабыць дома.

Яшчэ адзін запатрабаваны кірунак дзейнасці, які аб'яднаў дзясяткі тысяч людзей гэтай вясной — аказанне сацыяльнай падтрымкі адзінокім пажылым людзям, якія праз пандэмію вымушаны былі заставацца дома. Ім дастаўлялі прадукты і тавары першай неабходнасці, рэцэпты з паліклінік. Такая паслуга аказана больш за 52 тысячы разоў! Пік даставак прыйшоўся на красавік—май. І калі спачатку больш заявак паступала ў Чырвоны Крыж праз тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання, то ў хуткім часе людзі сталі тэлефанаваць наўпрост. Каардынатары размяркоўвалі заяўкі такім чынам, каб усе яны выконваліся ў той жа дзень.

— У пажылых людзей былі самыя розныя пажаданні, і гэта не толькі набыццё прадуктаў. Калі пажылы чалавек прасіў пагуляць з яго сабакам ці набыць корм, якога няма ў суседнім магазіне, зразумела, нашы валанцёры не маглі адмовіць, — дзеліцца Алена Русіновіч.

Падчас пандэміі Чырвоны Крыж сутыкнуўся з нечаканым выклікам: патрабавалася вялікая колькасць валанцёраў — значна больш, чым працавала тут звычайна. У кароткі тэрмін было рэкрутавана больш за 1800 чалавек.

— Мы стварылі базу, дзе ўсе ахвотныя маглі зарэгістравацца. А каардынатар у рэгіёне звязваўся з імі, праводзіў інструктаж. Усё навучанне праходзіла ў анлайн-рэжыме. Усяго аднойчы трэба было прыйсці ў офіс, каб атрымаць спецыяльную камізэльку, бэйдж і сродкі індывідуальнай аховы — пальчаткі, маскі і антысептык, — расказвае Алена Русіновіч.

Адметна, што ўсе валанцёры Чырвонага Крыжа былі застрахаваныя ад няшчасных выпадкаў, а таксама захворвання на каранавірусную інфекцыю.

— Многія з тых «спантанных» валанцёраў, якія далучыліся да нас у сакавіку—красавіку, сталі пастаяннымі. Яны гатовы падтрымліваць Чырвоны Крыж па іншых кірунках, — кажа суразмоўніца. — Мы назіралі вялікую актыўнасць, асабліва нашых маладых людзей. Кіроўцы былі гатовы або набыць прадукты і адвезці, або падвезці валанцёра з цяжкім пакетам. Адгукаліся службы таксі і дзяліліся прома-кодамі для бясплатных паездак. Кожны дапамагаў па меры магчымасці — хтосьці працаваў раз на тыдзень, нехта — кожны дзень. Самая вялікая запатрабаванасць паслуг дастаўкі, канешне, была ў Мінску. У дзень паступала да 200 заявак. Але ні адна паслуга не пераходзіла на наступны дзень. Валанцёры нават сем'ямі. А некаторыя валанцёры пазнаёміліся, працуючы ў нас на дастаўцы, і вырашылі стварыць сям'ю.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)



## «Добры тэлефон» не змаўкае

Для інфармавання і псіхасацыяльнай падтрымкі зноў-такі найперш пажылых людзей была арганізавана лінія «Добры тэлефон» (201 — нумар для мабільнага тэлефона, 122 — для гарадскога). На яе з пачатку красавіка патэлефанавала больш за 1,2 тысячы чалавек.

— Гэта валанцёрская лінія, і той, хто звяртаецца, мог атрымаць усю інфармацыю аб паслугах, запісацца на дастаўку. Але галоўная яе функцыя — псіхасацыяльная падтрымка. Бо многія людзі, якія знаходзяцца ў ізаляцыі, цяжка гэта пераносяць, — кажа **начальнік аддзела па рэагаванні на надзвычайныя сітуацыі і вышуку Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Віталь ТАРАШКЕВІЧ.** — Валанцёры і самі тэлефанавалі пажылым людзям, расказвалі пра важнасць самаізаляцыі, дыстанцыравання, ненаведвання месцаў масавага збору. Часам пажылыя людзі баяцца нагрузіць іншых нейкай праблемай, да некаторых мы нават выязджалі дадому, дапамагалі вырашаць бытавыя пытанні.

Нягледзячы на адноснае зацішша летам, «Добры тэлефон» працягваў працаваць і дзейнічае цяпер. Штодзень тут прымаюць тры-чатыры дзясяткі званкоў. Валанцёр Вольга Бладыка ў перапынку паміж тэлефанаваннямі расказвае, што прыйшла ў Чырвоны Крыж пару месяцаў таму, да гэтага таксама працавала валанцёрам у Цэнтры развіцця эфектыўнай камунікацыі «Жывая бібліятэка». Дзяўчына вучыцца на псіхолага на чацвёртым курсе факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ і ўпэўнена, што валанцёрскі вопыт спатрэбіцца ў прафесіі.

**Усё валанцёры Чырвонага Крыжа былі застрахаваныя ад няшчасных выпадкаў, а таксама захворвання на каранавірусную інфекцыю.**



Звычайным валанцёрам прыйшла ў Чырвоны Крыж у красавіку і **псіхолаг Валянціна РАКЕЦКАЯ.** Сёння яна — спецыяліст па псіхасацыяльнай падрыхтоўцы Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа і каардынуе работу валанцёраў на «Добрым тэлефоне».

— Мне была вельмі цікавая работа на інфалініі, таму я і прыйшла валанцёрам, — кажа дзяўчына. — Кожная гісторыя, дзе нам удалося дапамагчы, па-свойму кранальная. У нас ёсць наша бабуля Надзея, для якой інфалінія стала чымсьці родным. Яна жыве адна, цалкам страціла зрок. Бабуля тэлефануе нам вельмі часта, пазнаёмілася з усімі валанцёрамі, яна не страціла цікавасці да жыцця, абмяркоўвае ем з ёй усе падзеі. Для пажылых людзей вельмі важная такая падтрымка — калі пачынаеш размаўляць і распытваць чалавека, некаторыя з іх ад такой увагі да сябе нават пачынаюць плакаць.

## Садзейнічанне шматдзетным і няпоўным сем'ям і не толькі

— Калі першапачаткова мы меркавалі, што звяртацца да нас будуць толькі пажылыя людзі, то памыляліся — нам пачалі тэлефанаваць тыя, хто захварэў ці стаў кантактам першага ўзроўню і знаходзіўся на самаізаляцыі, — працягвае Алена Русіновіч. — Многія з іх — маладыя. Нягледзячы на дастатак, сацыяльную актыўнасць, ім давялося сядзець дома. Мы нікому не адмаўлялі ў самых розных сітуацыях.

Сэрвісы Чырвонага Крыжа, якія працавалі падчас першай хвалі COVID-19, застануцца даступныя і цяпер. Але дапамога будзе пашырана.

— Мы прааналізавалі нашу работу і звароты ў Чырвоны Крыж і разумеем, што, акрамя хваробы, людзі сутыкнуліся і з эканамічнымі наступствамі. Усе краіны-суседкі былі закрытыя, некаторыя, хто там працаваў, страцілі работу і мусілі вярнуцца дадому. Таму мы звернем увагу на такую катэгорыю, як шматдзетныя і няпоўныя сем'і, дзе страта адзінай крыніцы даходу — вялікая праблема. Яшчэ адна ўразлівая катэгорыя — людзі з інваліднасцю, якія маюць вялікія расходы на лекі. Сумесна з Міжнароднай федэрацыяй Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца мы распрацавалі праект па аказанні фінансавай падтрымкі названым катэгорыям грамадзян. Гэта будзе ваўчар на суму 50 франкаў (каля 140 рублёў. — **«Зв.»**). Хутка праграма пачне рэалізоўвацца, — адзначае Віталь Тарашкевіч.

Мяркуецца, што пакуль такая падтрымка будзе аднаразовай. Звесткі пра людзей, якія маюць патрэбу ў дапамозе, супрацоўнікі Чырвонага Крыжа атрымліваюць з дзяржорганаў. Таксама можна і самастойна звярнуцца ў арганізацыю, напісаўшы заяву і дадаўшы адпаведныя дакументы.

— Прааналізаваўшы сітуацыю ў свеце, мы зразумелі, што падчас ізаляцыі найбольш уразлівымі становяцца людзі без пэўнага месца жыхарства. Цяпер яны сканцэнтраваны ў цэнтрах часовага знаходжання. У нас маецца два свае цэнтры — у Гродне і Гомелі, дзе гэтыя людзі атрымліваюць дапамогу. І мы прынялі рашэнне падтрымаць іх прадуктовымі і гігіенічнымі наборамі, — дадае суразмоўнік.

Садзейнічанне будзе аказана і людзям, якія вызваліліся з месцаў пазбаўлення волі.

— Яны часта не маюць блізкіх і сродкаў да існавання, адчуваюць складанасці з працаўладкаваннем. Мы правялі сустрэчы з дэпартаментам выканання пакаранняў і наглядным органамі і вызначыліся з тымі, хто можа атрымаць нашу дапамогу. Гэта таксама прадуктовыя і гігіенічныя наборы. Прадуктовы разлічаны на тое, каб падтрымаць чалавека на працягу месяца. У асобных выпадках гэтыя людзі могуць разлічваць і на грашовы ваўчар. Ён дазваляе набыць любыя рэчы з асартыменту ў адной з гандлёвых сетак.

**Алена КРАВЕЦ.**

Сугучча

# Пандэмія літаратурнай дружбе — не перашкода

**На Міжнародным круглым стале пісьменнікаў і літаратуразнаўцаў «Мастацкая літаратура як шлях адзін да аднаго», які праходзіў у анлайн-фармаце ў рамках VII Міжнароднага кангрэса «Бібліятэка як феномен культуры. Краязнаўства і краіназнаўства ў захаванні культурнага шматаблічча», прагучала нямала цікавых ініцыятыў.**

Удзел у круглым стале ўзялі прадстаўнікі 11 краін. У асноўным — з постсавецкай прасторы. І гэта зразумела: расіянам і казахам, узбекам і літоўцам, прадстаўнікам тых народаў, у якіх некалі была агульная супольнасць, ёсць што абмяркоўваць; у іх ёсць і гісторыя, калі хочаце, генетычная памяць у дачыненні да творчых ініцыятыў, што некалі аб'ядноўвалі, дазвалялі разам ісці да стварэння ідэалаў гуманізму, да ўзвышэння прыярытэтаў маральнасці, духоўнасці. Час, несумненна, уносіць свае карэктывы — і з пункту гледжання сутнасных падыходаў, і ў плане геапалітычным. Але гэта не перашкодзіла ўдзельнікам круглага стала прапанаваць да рэалізацыі цэлы шэраг ініцыятыў. Пісьменніца з Узбекістана Рысалат ХАЙДАРАВА падкрэсліла, што варта надаць большую ўвагу справе мастацкага перакладу. І пэўныя крокі да гэтага робяцца непасрэдна ва Узбекістане. Сама Рысалат Хайдарава шмат часу аддае перакладу твораў беларускай літаратуры на ўзбекскую мову. Але пісьменніца заклікала да фарміравання сістэмных падыходаў, да пошуку тых фарматаў, якія б дазволілі выбіраць для перакладу найлепшае з нацыянальных літаратур. І гэта, несумненна, патрабуе кансалідацыі перакладчыкаў на прасторах СНД, правядзення міжнародных семінараў, супольных творчых і адукацыйных намаганняў — з разлікам на вывучэнне перакладчыкамі моў іншых народаў. «Важна перакладаць з арыгінала, — адзначыла Рысалат Хайдарава. — У такім выпадку пісьменніцкія арганізацыі павінны дапамагчы ВНУ сваіх краін, міністэрствам адукацыі ўключыцца ў абмен студэнтамі дзеля гэтай справы, у стварэнне спецыяльнасці кшталту «Творчая работа. Мастацкі пераклад». На памяці ў многіх — падобныя захады, якія некалі рэалізоўваў Літаратурны інстытут імя Максіма Горкага ў Маскве».

Глеб КУДРАШОЎ з Украіны — часты госць у Беларусі. Дацэнт Палтаўскага нацыянальнага педагагічнага ўніверсітэта імя У. Г. Караленкі, ён удзельнічаў і ў Днях беларускага пісьменства ў Слоніме, і ў нядаўняй Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі па выдавецкай справе на факультэце журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Спадар Глеб нагадаў пра Дні беларускай літаратуры ва Украіне і Дні украінскай літаратуры ў Беларусі ў 1975 і 1976 гадах, калі мастацкае слова вяло рэй у Кіеве, Мінску, іншых гарадах Украіны і Беларусі. Менавіта такія творчыя акцыі спрыялі ўмацаванню пазіцый інтэрнацыянальнага выхавання грамадства, дружбе і літаратур, і народаў. Плён такіх Дзён — устанаўленне помнікаў, мемарыяльных дошак, пасадка паркаў дружбы, выданне перакладных кніг і іншыя добрыя справы. Дарэчы, сам Глеб з'яўляецца аўтарам кнігі пра мемарыялізацыю жыцця і творчасці Тараса Шаўчэнкі ў Беларусі. Зараз рыхтуецца выданне гэтай кнігі ў перакладзе на беларускую мову. Палтаўскі даследчык і культуролаг прапанаваў, не чакаючы завяршэння пандэміі, не губляць часу і наладзіць правядзенне Дзён нацыянальных літаратур у фармаце анлайн-трансляцыі.



Пісьменнікі дзвюх рэспублік падчас Дзён беларускай літаратуры ва Украіне. 1975 год.

Прапанова ўкраінскага ўдзельніка круглага стала выклікала гарачае абмеркаванне. Як гэта зрабіць? Якія мерапрыемствы найперш правесці? Каго далучыць да прадстаўлення нацыянальных літаратур у іншых краінах?.. Гэтыя і іншыя пытанні актывізавалі пошук ініцыятыў. Напрыклад, па завяршэнні круглага стала казахстанскія калегі, а таксама літаратары з розных расійскіх рэгіёнаў выслалі Нацыянальнай бібліятэцы і Выдавецкаму дому «Звязда», які быў сярод арганізатараў гэтай дыскусійнай інтэрнэт-пляцоўкі, нямала важкіх, актуальных прапаноў. І, канешне, такія Дні татарскай, казахскай або ўзбекскай літаратур у Беларусі не могуць не атрымацца. У нашых краін ёсць агульная гісторыя літаратурных узаемадачыненняў, ідзе працяг літратурных сувязяў, выходзяць новыя перакладныя кнігі. Вось і зараз, напрыклад, дзякуючы сябрам беларускай літаратуры не застаўся незаўважаны ў розных краінах юбілей беларускага класіка Уладзіміра Караткевіча. У перыядычных выданнях Азербайджана, Казахстана, розных рэгіёнаў Расіі з'явіліся пераклады яго твораў на іншыя мовы. Дзякуючы намаганням доктара філалагічных навук Флоры НАДЖЫ ў Баку рыхтуецца да выдання кніга Караткевіча на азербайджанскай мове. Дні нацыянальных літаратур нагадалі б і пра адрасы памяці. У Беларусі ў розныя часіны жылі, працавалі, абаранялі гэту краіну пісьменнікі з Расіі, Казахстана, Азербайджана, Узбекістана, Туркменістана... Пад Лоевам загінуў у Вялікую Айчынную вайну ўзбекскі паэт Султан Джура. На беларускай зямлі спачылі ўдмурцкі пісьменнік Піліп Кедраў, грузінскі паэт Мірза Гелавані... На Беларусі партызанілі пісьменнікі — казах Адзій Шарыпаў, татарын Закі Нуры, калмык Міхаіл Хонінаў, рускі празаік, паэт Усевалад Саблін, які кнігу вершаў («Мсціўцы») выдаў у партызанскім лесе пад Рудзенскам...


Фота Кастуся ДРОБАВА.

З ідэяй наладжвання прэзентацый беларускіх кніг у Расіі на пляцоўках для студэнцкай моладзі выступіла намеснік дэкана гістарычнага факультэта Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук Аксана СОЛАПАВА. І наогул пра тое, што творчая моладзь павінна быць у эпіцэнтры літаратурнай дыпламатыі, гаварылі і беларускія ўдзельнікі круглага стала — паэты Алесь БАДАК, Мікола МЯТЛІЦКІ, перакладчык Аляксей ЧАРОТА і пісьменнікі, літаратуразнаўцы іншых краін — Мікалай РУСУ з Малдовы, Святлана АНАНЬЕВА з Казахстана, Закі АЛІБАЕЎ з Башкартастана...

Творчы запал, прыўнесены ў літаратурнае віртуальнае жыццё, — пра гэта сказаў на круглым стале намеснік генеральнага дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алесь СУША — павінен палымнець і надалей. І бібліятэчная пляцоўка для гэтага — ці не найлепшая прастора для аб'яднання ідэй, творчых ініцыятыў і культур, літаратур розных дзяржаў і народаў.

**Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

Фестываль

# «Лістапад-2020»: любоў да кіно яднае насуперак абставінам

**Ужо зусім хутка, з 6 да 13 лістапада 2020 года, XXVII ММКФ «Лістапад» зноў збярэ разам спецыялістаў і аматараў кіно. Сёлетні кінафорум пройдзе пад слоганам «Магія вобраза», які чарговы раз падкрэслівае ўнікальную прыроду кіно — яно здольнае ва ўсёй паўнаце раскрыць свет вакол нас. Да ўдзелу заяўлена каля 120 карцін з 50 краін свету. Расказваем, па якіх правілах пройдзе свята і што змогуць выбраць для прагляду аматары кінамастацтва.**

Сімвал фестывалю — герой казачнай прытчы Уладзіміра Бычкова «Горад майстроў» (гэтай знакавай кінастужцы сёлета спаўняецца 55 гадоў). Яна ўсхваляла свабоду і патрыятызм, гераізм і волю, што дазволіла казку ператварыць у кіно на ўсе часы. На фестывальнай афішы герой «Горада майстроў» — падмятальшчык Караколь — яркім акцэнтам упісаны ў прастору Мінска, горада, дзе і праходзіць традыцыйны кінафорум.

Цырымонія адкрыцця і закрыцця фестывалю адбудзецца ў кінатэатры «Масква», а паказы пройдуць у кінатэатрах «Цэнтральны», «Беларусь», «Піянер», Falcon Club Буцік Кіно і Silver Screen у Galileo. Фільмамі адкрыцця і закрыцця сталі «Урокі фарсі» Вадзіма Перэльмана і «Ікар» Мацея Пепшыцы.

Праграма асноўнага конкурсу ігравога кіно сёлета сабрала карціны буйных міжнародных кінафестываляў, што былі зняты ў постсацыялістычных краінах. Тут пакажуць дзевяць кінафільмаў, сярод якіх «Прыцемкам» Шарунаса Бартаса, «Вецер у галаве» Шуцзюнь Вэй, «Канферэнцыя» Івана І. Цвярдоўскага, «Эдэм» Агнес Кочыш, «Сапернік» Маркуса Ленца і іншыя. У кожнай з прадстаўленых работ падымаюцца вечныя і важныя тэмы.

Падчас прэс-канферэнцыі каардынатар фестывалю Мікалай Лаўранюк, які анансаваў праграму Нацыянальнага конкурсу, заўважыў, што «Лістапад» па-ранейшаму застаецца мостам у свет для айчыннай кінаіндустрыі:

— Беларускае кіно пакуль яшчэ знаходзіцца ў няпростай сітуацыі, аднак гэтая пляцоўка дыялогу вельмі важная для прафесіяналаў і гледачоў.

Як вядома, сёлета змяніўся фармат уручэння прызоў: арганізатары адмовіліся ад размяжоўвання ўзнагарод па секцыях ігравога, анімацыйнага і дакументальнага кіно. Цяпер журы будзе абіраць адзіны Гран-пры за найлепшы фільм, а таксама адзначаць дыпломамі і прызамі асобныя кінастужкі. На ўдзел у Нацыянальным конкурсе было пададзена каля 60 заявак, з іх больш чым дзясятак кінастужак трапілі ў праграму. Так, зможам убачыць «Эпітафію» Віктара Аслюка (аповед пра сакральнасць могілак), «Код продкаў» Уладзіміра Луцкага (работа, прысвечаная даследаванню беларускага і ўкраінскага фальклору, сувязям і гісторыі двух народаў), дэбютны поўны метр «Забароненая зона» Мітрыя Сямёнава-Алейнікава (трылер, дзея якога адбываецца ў чарнобыльскай зоне), «Мне трэба поціскаў...» Андрэя Куцілы (гісторыя ўзаемаадносін маці і дачкі-інваліда) і іншыя цікавыя кінакарціны.

На конкурс нацыянальных кінашкол, на які адбіраюцца найлепшыя работы маладых дакументалістаў з розных краін, прыйшло каля 200 заявак, а ў выніковую праграму трапіла 19 з кінашкол Расіі, Харватыі, Нарвегіі, Польшчы, Венгрыі, Германіі, Швейцарыі, Італіі, Славакіі, ЗША, Босніі і Герцагавіны. Напрыклад фільм «Чыстае палатно. Мастацтва сям'і» кітайскі рэжысёр Маамаа Чжаа прысвяціла свайму бацьку, які пасля інсульту на дзесяць гадоў кінуў маляваць. Кінаработа «Пустэча ўнутры» падымае пытанне, якую цану чалавек згодны праціць за сваю мару і ці варты вынік таго? І кожная кінастужка — гэта гісторыя, якая не пакіне гледача абыякавым, а дасць падставу разважаць і абмяркоўваць убачанае на экране. Як паведамлялі раней, сёлета на конкурсе змяніліся правілы: акрамя Міжнароднага журы кінематаграфістаў кінастужкі будзе ацэньваць таксама Міжнароднае студэнцкае журы, у складзе якога будуць самі ўдзельнікі конкурсу. То-бок, з'явіцца пляцоўка для абмеркавання работ і магчымасць будаваць міжнародную суполку маладых рэжысёраў.




Фільмы з Расіі, Германіі, Сербіі, Харватыі, Катара, Латвіі, Нарвегіі, Швецыі, Аўстрыі і іншых краін зможам убачыць на асноўным конкурсе дакументальнага кіно, які будзе дэманстраваць 12 карцін рознай тэматыкі. Напрыклад, трылер «Толькі д'ябал жыве без надзеі» Магнуса Эртэна заснаваны на рэальных падзеях і распавядае гісторыю кахання і здрады, шпіянажу і палітычных забойстваў. «Мая любімая вайна» — гэта асабістая гісторыя рэжысёра Ілзэ Буркоўска-Якабсэн, якая падчас «халоднай вайны» жыла ў Латвіі. Стужка аб сталенні чалавека, пошуках сябе і спробах пазбегчы ідэалагічнага прэсінгу пры аўтарытарным рэжыме. Кінастужка «Epicentro» Хуберта Заўпера дэманструе яркі і метафарычны партрэт посткаланіяльнай «утапічнай» Кубы і з'яўляецца фільмам-роздумам аб часе, імперыялізме і кінематографе.

Што да конкурсу фільмаў для дзіцячай і юнацкай аўдыторыі, то тут адабраны і заяўлены ў праграме такія карціны, як «Клуб брыдкіх дзяцей» (Нідэрланды), «Летнія гарэзы» (Германія, Славакія), «Райскі лагер» (Фінляндыя), «Сёстры» (Нарвегія), «Зграя» (Чэхія, Славакія, Латвія), «Джэкі і Оп'ен» (Нідэрланды). І ўсе яны — пра жыццё «тут і зараз», пра эвалюцыю сталення, спробу падлеткаў самастойна вырашаць свае праблемы і прымаць рашэнні.

Яшчэ адзін конкурс фестывалю пад назвай «Маладосць на маршы» ў праграме сабраў 11 кінастужак, дзе будуць прадстаўлены як дэбюты, так і работы маладых рэжысёраў, якія ўжо паспелі заявіць пра сябе ў творчасці.

Сёлета «Лістапад» ладзіцца ў няпростых для ўсёй кінаіндустрыі ўмовах, але ўсё ж такі чакае сустрэчы са сваёй публікай і гасцямі. Так, для замежных членаў журы і прадстаўнікоў медыя дырэкцыя форуму рыхтуецца правесці яго ў анлайн-фармаце. Паказы для гледачоў пройдуць у кінатэатрах з забеспячэннем сацыяльнага дыстанцыявання і ўсіх мер бяспекі.

**Алена ДРАПКО.**

Вернісаж

# КАЛІ ПЛАКАТЫ СТАНАВІЛІСЯ ЗБРОЯЙ

**Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны запрашае пазнаёміцца з савецкай графікай і карыкатурай ваеннага часу. У наведвальнікаў ёсць унікальная магчымасць пабачыць арыгіналы, створаныя ў перыяд з 1939 па верасень 1945 года. Такія дакументы не часта выстаўляюцца на паказ. Справа ў тым, што тэрмін захоўвання паперы — сем дзесяцігоддзяў, а размешчаным на часовай экспазіцыі работам ужо каля 80 гадоў, і для таго каб гэтая спадчына была даступная і наступным пакаленням, музейшчыкі ствараюць для яе захоўвання спецыяльныя ўмовы. Дарэчы, выстаўка «Зброяй мастацтва» будзе працаваць толькі да 27 лістапада.**



Захавальніца калекцыі плакатаў Галіна ПАЎЛОЎСКАЯ знаёміць з работамі, якія прысвечаны падзеям у Беларусі.

## Агітацыйныя бомбы

Сёння калекцыя музея савецкага палітычнага плаката перыяду Вялікай Айчыннай вайны налічвае каля 500 арыгіналаў па 400 найменнях. Над яе стварэннем працавала не адно пакаленне работнікаў установы, таму невыпадкова выстаўка прымеркавана да 76-годдзя самога музея.

Першыя плакаты ўстанова атрымала адразу пасля яе стварэння ад Беларускага штаба партызанскага руху. Асобныя экзэмпляры перадавалі калегі з іншых гарадоў. Многія работы, якія вызначаюцца мастацкай і гістарычнай каштоўнасцю, работнікі прывозілі з камандзіровак, закуплялі ў калекцыянераў, атрымлівалі ў падарунак ад саміх творцаў ці іх сваякоў. Напрыклад, пяць гадоў таму ўстанову наведала ўдава ленінградскага мастака Міхаіла Гардона, які ў гады вайны працаваў у блакадным горадзе, і перадала музею арыгінальны плакат часоў вайны.

У ваенныя гады сродкі масавай інфармацыі і агітацыі выйшлі на перадавую. Плакат быў адным з самых распаўсюджаных інструментаў новай інфармацыйнай вайны. Нездарма ў той час яго называлі «агітацыйнай бомбай». Мастацтва падтрымлівала і ўмацоўвала баявы дух чырвонаармейцаў, партызан і працаўнікоў тылу, садзейнічала мабілізацыі, надавала надзею і веру ў Перамогу. Вялікую ролю ў той час набыла сатыра. Менавіта такія плакаты зараз прадстаўлены на экспазіцыі ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Натуральна, немагчыма за адзін раз азнаёміць з усёй калекцыяй плакатаў, што захоўваецца ў музеі, часовая экспазіцыя дэманструе найбольш вядомыя ў тыя часы плакатныя лісты ў героіка-сатырычным і сатырычным жанрах, адабрана ўсяго 36 работ, якія знаёмяць з творчасцю выдатных майстроў-карыкатурыстаў.

Для сучаснікаў гэта ўжо не проста ілюстрацыі, але і гістарычныя дакументы. У 40-я гады мастакі ў сваіх работах асвятлялі ўсё, што адбывалася на фронце і ў тыле, распавядалі пра розныя перыяды вайны.

## Аловак замест вінтоўкі

У калекцыі музея захоўваецца самы першы плакат часоў Вялікай Айчыннай, які з'явіўся на вуліцах Масквы ўжо на трэці дзень вайны. Ён створаны Кукрыніксамі — гэта псеўданім, «сабраны» з частак прозвішчаў трох мастакоў, Міхаіла Купрыянава, Парфірыя Крылова і Мікалая Сакалова. Да Вялікай Айчыннай вайны яны займаліся літаратурным шаржам, рабілі графіку для часопісаў і газет. Іх творчасць ухваляў Максім Горкі. Незвычайным было тое, што свае работы яны стваралі разам. Бралі ліст і паступова развівалі пэўную ідэю, кожны нешта дадаваў. Яшчэ да вайны імі быў распрацаваны вобраз Гітлера — да падпісання дагавора аб межах і сяброўстве паміж СССР і Германіяй у газетах дазвалялася крытыка фашысцкага рэжыму. Ужо ўвечары 22 чэрвеня гэты творчы калектыў стварыў эскіз плаката «Бязлітасна разграмім і знішчым ворага», на якім карыкатурны Гітлер разрывае дагавор аб ненападзенні. Першае мастацкае рашэнне было такім, што штык пранізвае руку фюрэра. Але на наступны дзень, калі стала зразумела, што вайна ўжо не нагадвае лакальны канфлікт, і маштабы не могуць быць сур'ёзныя, Кукрыніксы змянілі творчае рашэнне: на плакаце штык пранізвае ўжо галаву Гітлера. Першыя работы выконваліся толькі ў двух колерах — усё для таго, каб іх як мага хутчэй можна было запусціць у друк.



Такой у 1942 годзе Барыс Яфімаў паказаў паражэнне нямецкіх войскаў пад Масквой.

У 1970 годзе самі Кукрыніксы перадалі ў дар мінскаму музею плакаты на беларускую тэматыку, якія адлюстроўваюць партызанскі рух, «рэйкавую вайну» і акружэнне 105-тысячнай фашысцкай групоўкі пад Мінскам (вядомае як Мінскі «кацёл»).

Размешчана на часовай экспазіцыі і работа, выкананая ў пачатку вайны Аляксеям Какарыкіным «Бі фашысцкага гада». Можна заўважыць, што спачатку мастакі пісалі работы ў стылі, які актыўна выкарыстоўваўся ў часы Грамадзянскай вайны, калі вораг паказваецца метафарычна, у выглядзе скарпіёна, ці нейкай жахлівай істоты, птушкі або звера.

Куратар выстаўкі і загадчык аддзела пісьмовых і мастацкіх крыніц, захавальніца калекцыі плакатаў Галіна ПАЎЛОЎСКАЯ, якая знаёміць мяне з выстаўкай, звяртае ўвагу на тое, што вобразны малюнкі дапаўняюць кароткія, сціслыя, ёмістыя тэксты. У гады вайны мастакі актыўна супрацоўнічалі з Самуілам Маршаком — дзіцячы пісьменнік дапамагаў пісаць рыфмаваныя тэксты, якія дапаўнялі плакат, узмацнялі яго эмацыянальнае ўздзеянне.

Мы спыняемся каля плаката, прысвечанага разгрому гітлераўцаў пад Масквой, які ў 1942 годзе напісаў наш зямляк Барыс Яфімаў. Ён нарадзіўся ў 1900 годзе ў Смілавічах. Перад пачаткам вайны сатырык, карыкатурыст актыўна супрацоўнічаў з рознымі выданнямі — друкаваўся ў «Звязде», «Известиях», часопісах «Огонёк» і «Крокодил». Нягледзячы на тое што яго родны брат, публіцыст, вядомы нам пад псеўданімам Міхаіл Кальцоў, перад вайной быў рэпрэсаваны і расстраляны, мастак не пераставаў змагацца на сатырычным полі. У 1943 годзе нават выпусціў цэлую кнігу ў выдавецтве «Мастацтва» з сатырай на Гітлера і ягоную зграю. Барысу Яфімаву ўдалося пабываць на Нюрбергскім працэсе і на свае вочы ўбачыць на лаве падсудных тых, каго ён маляваў. Пражыў мастак 108 гадоў, у 107-гадовым узросце быў прызначаны галоўным мастацкім рэдактарам газеты «Известия», актыўна працаваў, пісаў мемуары, сустракаўся з маладзёжнай аўдыторыяй.

На выстаўцы паказаны і работы плакатыстаў Ленінграда. Ленінградскія мастакі, якія падчас савецка-фінляндскай вайны выпускалі сценгазету «Карандаш», арганізавалі выпуск серыі плакатаў «Боевой карандаш». У блакадным горадзе выйшла 102 нумары.

У гады вайны маскоўскія і ленінградскія мастакі працавалі таксама над серыяй «ОКНА ТАСС». У арыгінале работы ствараліся ўручную пры дапамозе празрыстых трафарэтаў звычайнымі фарбамі. У вышыню яны маглі быць да трох метраў. Плакаты вывешваліся ў вітрынах магазінаў, на сценах і агароджах побач са зводкамі Саўінфармбюро.

У экспазіцыі можна пабачыць і «комiксы» — так, гісторыі ў малюнках былі прыдуманы савецкімі мастакамі яшчэ ў часы Грамадзянскай вайны.

Не маглі супрацоўнікі музея не паказаць плакаты аднаго з самых вядомых плакатыстаў Віктара Дэні. У музеі захоўваецца 11 яго работ, асабліва каштоўныя — з дароўнымі надпісамі аўтара. За гады вайны ён стварыў галерэю партрэтаў Гітлера, змяняючы яго фізіяномію з кожным месяцам. Вялікае значэнне мастак надаваў колерам і напісанню літар, нават подпісы на яго плакатах падаюцца вострымі, як джала. Спачатку мастак супрацоўнічаў з паэтам Дзям'янам Бедным, а пасля рыфмаваныя надпісы прыдумваў сам. У гады вайны ён быў у паважаным узросце, але, нягледзячы на хваробы, працягваў працаваць. Яго не стала ў 1946 годзе.



Самы першы плакат, які з'явіўся на вуліцах ужо на трэці дзень вайны.

Бясспрэчна, сатыра адыграла вялікую ролю ў справе Перамогі. Калі да вайны было ўсяго каля дзясятка прафесійных плакатыстаў, то для стварэння «інфармацыйных бомб» мастакоў адклікалі з франтоў, дзясяткі майстроў станковага жывапісу, графікі і скульптуры сталі працаваць над плакатамі. Іх работы выходзілі тыражамі ад 2 да 200 тысяч, а некаторыя патрыятычныя плакаты — такія як «Радзіма-маці кліча!» — наогул вытрымалі мільённыя тыражы, выходзілі на розных мовах.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**



Адкрыццё выстаўкі «Зброяй мастацтва».

Вёскі, якія знікаюць: апошнія жыхары

*Манцы Пружанскага раёна*

# КОЛЕРЫ КАСТРЫЧНІЦКІХ ВЯРГІНЬ

**І шанцуе ж мне апошні час на ардэнаносцаў! Як ні заеду ў маленькую вёсачку, што застаецца на карце жылых населеных пунктаў з-за двух ці трох сталых жыхароў, дык будучы герой тут жа прыносіць з шафы запаветную скрыначку з узнагародамі. Глядзі, маўляў, які працаўнік я быў, як вызначыўся ў сваім калгасе, раёне! Вось і на гэты раз толькі завіталі да Вольгі Максімаўны Грыцук, а яна дастае з шуфлядкі ордэн «Знак Пашаны» ды іншыя ўзнагароды, а потым агаломшвае заявай: «Вой, як я працавала некалі, і зараз, здаецца, пайшла б на работу, але ўжо не бяруць».**



Вольга ГРЫЦУК
і старшыня Шарашэўскага сельскага Савета Святлана АМЕЛЬЯНЕЦ.

## ДАЧКА СВАЙГО БАЦЬКІ

Гэтай жанчыне нізавошта не дасі яе 88 гадоў: энергічная, рухавая, працавітая, усмешлівая. Раніцай села на веласіпед і паехала ў Шарашэва па справах. Зяць ёй не раз прапаноўваў пад'ехаць на машыне ды адвезці на нядзельную службу ў храм, яна адмаўляецца: «Хіба зімой, як замяце. А цяпер я сама дабяруся, там і пагаварыць са знаёмымі трэба потым, у магазін зайсці, каб не спяшаючыся».

Вольга Грыцук паказвае нам свой прыгожы падворак. Апошнім часам захапілася развядзеннем вяргінь, яны, розных колераў і розных гатункаў, зараз радуюць вока дружным цвіценнем. Яе знаёмыя скардзяцца, што ў іх не растуць кветкі, а ў яе дык ажно буяюць. Гаспадыня дзеліцца сакрэтам: і ў яе не вельмі раслі на адным месцы, дык яна вясной пасадзіла іх на другім участку, там зямля аказалася больш прыдатная для гэтых кветак, яны разрасліся. А ў яе ўсё так — калі бярэцца, то робіць як найлепш. Кажа, раней, калі свіней трымала, тыя раслі самымі вялікімі ў акрузе. Ну і на рабоце такая ж увішная была, не ўсім, зразумела, ордэны ў калгасе давалі.

Вырасла Вольга ў суседніх Пацынічах. Памятае, як у вайну ў лесе сядзелі з бабуляй. Бо лясы кругом, балоты. Партызаны былі, таму немцы з насельніцтвам не цырымоніліся. Вось людзі і баяліся. Ну а пасля вайны сталі арганізоўваць калгасы. «Бацька пайшоў на сход, доўга не было, — расказвае Вольга Максімаўна. — А калі вярнуўся дадому, сказаў, што сход праходзіў цяжка, людзі не хацелі запісвацца, тады ён падышоў і запісаўся першы. Маці, вядома, у слёзы. Ніхто ж не ведаў, як гэта будзе ў калгасе. Але ж нічога, прывычаіліся».

## СТАРЭЙШЫНА СЯМ'І

У канцы 50-х Вольга выйшла замуж і пераехала да мужа ў Манцы. Тады хата была меншая, а жылі ў ёй дзевяць чалавек. Бо сям'я старэйшага сына гаспадароў таксама перасялілася да бацькоў, у іх згарэў дом ад удару маланкі. Але паступова старэйшы брат адбудаваўся, а яны з мужам сталі добраўпарадкоўваць гэтую хату, дабудавалі памяшканне для кухні, веранду. «Драўніна ў нас пушчанская, на стагоддзі разлічаная, раней не на адно пакаленне хату ставілі», — разважае гаспадыня. Вось тут яны пражылі з гаспадаром паўстагоддзя, дзвюх дачок выгадавалі. Зараз ужо шэсць гадоў жыве адна. Але ж бабуля багатая — мае пяць унукаў, 12 праўнукаў, яны не забываюць. Старэйшы праўнук у аграрна-тэхнічным універсітэце вучыцца, неўзабаве 21 год. «Пытаю, ці хутка ты, Дзяніс, жаніцца будзеш? Я ж не з цікаўнасці, мне ведаць трэба, каб грошай сабраць на вяселле», — смяецца Вольга Максімаўна. А ён мне: «Не спяшайся, бабуля, трэба вучобу скончыць». У праўнука на вяселлі пагуляць — ганаровая місія, не кожнаму ўдаецца». За сям'ю сваю маці і бабуля сямейства спакойная, усе выраслі годнымі людзьмі, працуюць, вучацца. Толькі пра здароўе старэйшай дачкі непакоіцца, бо стала яно падводзіць.

## СТАКАН МАЛАКА Ў «ПАРЫЖСКАЙ КАМУНЕ»

Але зноў вяртаемся да яе высокіх узнагарод. Былая калгасніца расказвае, за што атрымала ордэн. Працавала раней і звеннявой ў паляводстве. Лён сушылі дома, прыносіла яго з пылам, брудам і закідвала на печ. Потым церлі яго рукамі. «Колькі льну перацерлі, да гэтай пары рукі памятаюць». А яшчэ ездзіла па хатах і збірала попел у людзей. Для лёну гэта добрае ўгнаенне. Таму каня запрагала і ездзіла ад хаты да хаты. Вось так вырошчвалі той лён. А буракоў як звеннявая брала сабе гектар, іншым жанчынам выдзялялі па палове гектара. Трэба было два разы апалоць, а потым вырваць, пагрузіць у машыну.

— Калі вызвалілася месца на ферме, пайшла даяркай, — працягвае аповед былая калгасніца. — Тады не так працавалі, як зараз, трэба было кармы разгрузіць, каровам раздаць, насілі той цяжкі сілас у такіх, як мы называлі, калысках. А ў мяне сястра побач працавала, яна кульгавая была. Дык яе каровам я таксама корму нацягвала. Бывала, муж прыходзіў, дапамагаў, але яму не заўсёды выпадала, сваёй работы на пілараме хапала.

Згадала былая працаўніца калгаса «Парыжская камуна» цікавы выпадак з праверкай якасці работы. Было гэта, калі толькі-толькі сталі пераходзіць з ручной дойкі на механічную. Пасля таго як выдойвалі карову апаратам, старанная даярка астаткі выдойвала рукамі, а іншая і так пакідала. Дык вось аднойчы на ферму завітала камісія — акурат пасля вячэрняй дойкі. Пажадалі праверыць, ці добра падоеныя каровы. Вольга Грыцук прапанавала ім шклянку ў якасці посуду. Яны ўзялі сасуд з недаверам, толькі з яе 12 кароў тыя інспектары не надаілі і шклянкі. А ў групах некаторых іншых даярак атрымалі амаль па вядры малака. Вось тады, мусіць, да яе і сталі прыглядацца як да патэнцыйнага перадавіка. У выніку ў 1986 годзе даярку ўзнагародзілі ордэнам «Знак Пашаны».

## ДУБ АД ПРАДЗЕДА

Цяпер Вольга Максімаўна дагледае агарод, сваю няхітрую гаспадарку. Ёсць некалькі курачак ды кошка з кацянятамі. Кажа, што на газавай пліце амаль не гатуе, толькі падагравае. Распальвае кожны дзень пліту каля печы: па-першае, для цяпла ў хаце, а па-другое, там і прыгатуецца смачнейшае. Газету выпісвае, тэлевізар глядзіць, каб ведаць, што ў свеце робіцца. Са сталых жыхароў у вёсцы засталося дзве жанчыны — яна і Валянціна Манцэвіч. На радасць пенсіянеркам аблюбавалі гэты куток і дачнікі. Найбліжэйшы сусед Вольгі Грыцук — Барыс Габец. Барыс Васілевіч працуе ў Шарашэўскім лясніцтве Нацыянальнага парку, тут купіў хату, побач узвёў дачны дом. Ён жа стараецца падтрымліваць парадак у вёсцы, напрыклад устанавіў крыж. І цяпер крыж побач са старымі дрэвамі, якія ўтвараюць арку, ажыўляе гэты ўезд. А дрэвы тут асаблівыя. Па ўсёй вёсцы растуць векавыя дубы. Дарэчы, Барыс Габец прызнаўся, што яго і прывабілі гэтыя дубы як сімвал нейкай спрадвечнасці, пастаянства.

У двары Вольгі Грыцук таксама расце дуб, якому гадоў дзвесце. Паводле сямейнага падання, яго пасадзіў прадзед мужа. Ну а цяперашняя гаспадыня не так даўно задумала спілаваць дрэва, бо яно ўяўляе пэўную пагрозу для дома. Ужо і спецыялісты было прыехалі. Але ўсе сталі адгаворваць Вольгу Максімаўну, і найперш яе новы сусед. Тады сышліся на тым, што зрэзалі адну галіну. Ну і мы са старшынёй сельскага Савета Святланай Амельянец падтрымалі меркаванне абаронцаў дрэва. Відаць, што і гаспадыня вагаецца: «Ну то няхай пастаіць, паграбу яшчэ гэтыя жалуды». Іх кожны дзень пад ногі падае столькі — утвараецца амаль што жалудовы дыван, на якім можна паехаць і паслізнуцца, таму кожны дзень іх трэба зграбаць. Але ж стары дуб таго варты...

Святлана Амельянец сказала, што для яе гэта вёска асаблівая. Калі дрэнны настрой, калі на рабоце праблемы, калі цяжка на душы, стараецца прыехаць сюды, пагаварыць з жыхарамі, пахадзіць тут. Нават паўгадзіны бывае дастаткова, каб вярнуць душэўны спакой. «Тут цішыня асаблівая, як цяпер кажуць, энергетыка станоўчая, можа, гэтыя векавыя дубы яе падтрымліваюць, можа, што іншае, — гаворыць Святлана Анатолеўна. — І відаць, не толькі я гэта заўважыла. Вось і з Брэста нядаўна чалавек купіў старую хату, будзе ўладкоўваць. А Брэст жа не блізка. Добра, хоць дачнікі не даюць згаснуць жыццю ў Манцах».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Горняк» (продавец)**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ОДНИМ ЛОТОМ ИМУЩЕСТВА В СОСТАВЕ:**

**- здание главного корпуса винодельческого завода, склад готовой продукции** *(составные части и принадлежности: кирпичное здание главного корпуса винодельческого завода, склада готовой продукции Б1-2/к, с навесом 1)*, **инв. № 644/С-50968, общая площадь 1243,1 кв. м;**

**- здание автогаража** *(составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание автогаража – Б1/к)*, **инв. № 644/С-50958, общая площадь 130,1 кв. м;**

**- здание насосной** *(составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание насосной Б1/к, подземная часть (Б1/к), пристройка 1)*, **инв. № 644/С-50959, общая площадь 19,7 кв. м;**

**- здание склада соков** *(составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание склада соков Б1/к)*, **инв. № 644/С-50967, общая площадь 113,2 кв. м;**

**- здание заводоуправления** *(составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание заводоуправления – Б1/к)*, **инв. № 644/С- 50961, общая площадь 91,2 кв. м;**

**- здание конторы** *(составные части и принадлежности: двухэтажное кирпичное здание конторы Б2/к)*, **инв. № 644/С-50957, общая площадь 233,9 кв. м;**

**- здание проходной** *(составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание проходной Б1/к)*, **инв. № 644/С-50960, общая площадь 30,1 кв. м;**

**- здание консервного цеха** *(составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание консервного цеха – Б/1/к)*, **инв. № 644/С- 50956, общая площадь 891,3 кв. м;**

**- здание котельной** *(составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание котельной – Б1/к)*, **инв. № 644/С-50955, общая площадь 193,1 кв. м;**

**- здание спиртохранилища** *(составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание спиртохранилища – Б1/к)*, **инв. № 644/С- 50953, общая площадь 148,9 кв. м;**

**- здание насосной с водонапорной башней** *(составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание насосной с водонапорной башней – Б1/к)*, **инв. № 644/С-50963, общая площадь 15,3 кв. м;**

**- здание склада запчастей** *(составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание склада запчастей Б1/к, навес 1, крыльцо)*, **инв. № 644/С-50966, общая площадь 408,5 кв. м (далее – Объекты).**

**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 625085409301000312 площадью 2,2471 га (право аренды по 22.04.2043) по адресу: Минская область, Солигорский район, Чижевичский с/с, д. Погост-2, ул. Центральная, 18А.**

*Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав: водоохранная зона Солигорского водохранилища, пл. 2,2417 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) – **324 840,60** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены (**32 484,06** бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объектов производится в течение 20 (двадцати) банковских дней после проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение аукциона, в размере 4 (четырех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **25.11.2020** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **20.11.2020** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17, 136-31-11.**

**ОАО «ПРОМЭЛЕКТРОМОНТАЖ»**

**извещает своих акционеров (их представителей) о проведении 05 ноября 2020 г. внеочередного общего собрания по адресу: г. Минск, ул. Аранская, 13, каб. 15.**

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

1. О переименовании Общества.
2. О внесении изменений в устав Общества и утверждении его новой редакции.

Место проведения собрания по месту нахождения ОАО «ПРОМЭЛЕКТРОМОНТАЖ»: г. Минск, ул. Аранская, 13, каб. 15.

Начало работы собрания в 12.00.

Регистрация участников собрания с 11.00 до 11.50 в день проведения собрания по месту его проведения. Акционеру при себе иметь документ, удостоверяющий личность, представителю акционера – документ, удостоверяющий личность, доверенность или договор.

Список акционеров для регистрации участников собрания будет составлен по данным реестра акционеров на 1 ноября 2020 г.

Орган, созывающий собрание: совет директоров Общества, основание созыва: протокол от 23.10.2020 № 23-10/2020.

С материалами по вопросам повестки дня собрания можно ознакомиться в рабочие дни (понедельник–пятница) с 14.00 до 17.00, начиная с 26.10.2020, по месту нахождения Общества.

*Совет директоров ОАО «ПРОМЭЛЕКТРОМОНТАЖ»*

УНП 100088916

# ШЛЮБНАЯ ГІСТОРЫЯ

## Каб правесці вясельную цырымонію ў адпаведнасці са старадаўнімі абрадамі, у Капыльскі краязнаўчы музей прыязджаюць пары з розных куткоў Беларусі

**Яшчэ гадоў 30 таму маладыя і іх госці былі непатрабавальныя і не разбэшчаныя. Абмен пярсцёнкамі, пацалунак, лебедзі на капоце, немудрагелістыя конкурсы для гасцей, разразанне торта — вось, напэўна, і ўвесь няхітры набор вясельных рытуалаў «па-савецку». Сёння адзін з найважнейшых дзён у жыцці кожнай пары жаніх і нявеста хочуць зрабіць сапраўды незабыўным. «Творчыя вяселлі» і «эка-вяселлі», у «вясковым стылі» і ў стылі культавых серыялаў, вяселлі ў старадаўніх сядзібах, у лесе, на беразе мора... Галоўнае, каб хапіла грошай, а фантазія ў wedding-агенцтваў не заканчваецца.**

Адзін з галоўных вясельных трэндаў апошніх гадоў — аўтэнтычныя вяселлі ў народным стылі, са старадаўнімі касцюмамі і абрадамі. І гэта, дарэчы, не патрабуе значных матэрыяльных укладанняў. Напрыклад, маладыя пары, якія цікавяцца вяселлямі з беларускім нацыянальным каларытам, прыязджаюць у Капыльскі краязнаўчы музей.

### ПАМІЖ МІНУЛЫМ І БУДУЧЫМ

Тут вясельныя цырымоніі пачалі праводзіцца яшчэ ў 2008 годзе — нават раней, чым такую магчымасць прапанавалі жаніхам і нявестам музеі ў Мінску і абласных цэнтрах. Дарэчы, калектыў капыльскага музея — наватар не толькі ў гэтым. Ён стаў адным з першых, дзе большасць экспанатаў можна патрымаць у руках.

— Гэта робіць музей жывым, цікавым для наведвальнікаў, — кажа яго **дырэктар Валянціна ШУРАКОВА.** — Патрымаць у руках гісторыю — хіба гэта не цікава!

Экспазіцыя Капыльскага краязнаўчага музея ўнікальная — тут усе рэчы сапраўдныя, старадаўнія. Ніякіх муляжоў. А як наконт традыцыйнага «галаўнога болю» музейшчыкаў — захаванасці экспанатаў?

— Гэта, вядома, вельмі важна, — тлумачыць суразмоўца. — І мы робім для гэтага ўсё. Але не менш важна, каб людзі маглі ў прамым і пераносным сэнсе дакрануцца да гісторыі сваёй зямлі і адчуць сувязь з яе мінулым і будучыняй.

За 12 гадоў, якія ў Капыльскім краязнаўчым музеі праводзяцца аўтэнтычныя вясельныя цырымоніі, сюды прыязджалі самыя розныя пары. Часцей, вядома, нявесты — у пышных вясельных сукенках з дэкальтэ, а жаніхі — у сучасных касцюмах, але бывае, што ўборы маладых і іх гасцей вытрыманы ў строгай адпаведнасці з канцэпцыяй народнага вяселля.

— Мне запомнілася пара з Мінска — і жаніх, і нявеста, і госці былі апранутыя ў старадаўнія строі. Малады — у кашулю з лёну, такія ж штаны, белыя валёнкі. Маладая — таксама ў валёначках, у доўгай белай даматканай кашулі і ў маленькай безрукаўцы. Гасцей было няшмат, толькі моладзь — і ўсе яны ў беларускіх строях. Гэта было проста выдатна!

Пахадзіць па музейных залах і «пагуляць у даўніну» і маладым, і іх гасцям бывае значна цікавей, чым увесь вечар прасядзець за сталамі, заўважае дырэктар музея.

— Ну а мы, праводзячы вясельную цырымонію, прыцягваем у нашы залы шмат людзей, якія ў іншай сітуацыі ў музей, хутчэй за ўсё, не прыйшлі б. І некаторыя з гасцей тых вяселляў вяртаюцца ў музейныя залы ўжо самі, каб пазнаёміцца з гісторыяй сваёй зямлі ў больш спакойнай абстаноўцы.



### АДЧУЙ СЯБЕ КНЯЗЕМ

Адразу з ЗАГСа маладыя адпраўляюцца ў музей, дзе іх чакаюць выпрабаванні і старадаўнія абрады. Каля ўваходу ў будынак маладых сустракаюць супрацоўнікі музея, апранутыя ў нацыянальнае адзенне — капыльска-клецкі строй. Маладая пара праходзіць праз арку са стужкамі і сустракае на сваім шляху першую перашкоду. Проста на парозе ляжыць чырвоная стужка.

— Даўней такую стужку клалі на парог дома, куды малады павінен весці сваю жонку, — расказвае суразмоўца.

І гэтую перашкоду трэба пераадолець правільна. Ні ў якім разе не павінен малады муж пераступаць стужку самастойна, пакінуўшы жонку за спінай — гэта дрэнная прыкмета. Ён мусіць узяць каханую на рукі і пераступіць праз перашкоду разам з ёй.

— Калі малады не можа сцяміць, што рабіць, мы прапануем яму папрасіць падказку ў старэйшага пакалення гасцей, — кажа Валянціна Леанідаўна.

Лагічна, што капыльскі музей стаў своеасаблівым цэнтрам вясельнай абраднасці. Бо сама назва гэтага старадаўняга горада нібыта складзена з іменаў двух закаханых. Паводле падання, там, дзе цяпер стаіць Капыль, у даўнія часы ўзвышаўся грозны замак багатага князя. Недалёка ад замка цякла рэчка, якая разлівалася возерам каля княжацкіх муроў. У князя была адзіная дачка-прыгажуня. Як водзіцца, палюбіла князёўна звычайнага пастуха. У адну навальнічную ноч закаханыя вырашылі ўцячы, каб ажаніцца і пазбавіцца ад саслоўных абмежаванняў. Князь адправіў за дачкой пагоню. Але возера схавала закаханых, накрыўшы іх велізарнай хваляй. Даведаўшыся, што любімая дачка патанула, князь пракляў возера і раку, і ў той жа момант яны сышлі ў зямлю. А на іх месцы з часам з'явіўся горад, назва якога спалучыла імёны князёўны і яе каханага — Ко-поль (закаханых звалі Коля і Поля), а пазней — Капыль. Гэтая легенда распавядаецца маладой пары. Пад апладысменты гасцей ім уручаецца «княжацкая грамата», якая сведчыць аб тым, што яны заключылі шлюб.

На старадаўнім гербе Капыля — ражок: гэта старажытны край паляўнічых. І навяўленаму мужу прапануецца даказаць, што ён — добры здабытчык. Лук, стрэлы і мішэнь — далёка не кожны сучасны мужчына здольны справіцца з задачай!

— Гэтая частка цырымоніі праходзіць заўсёды вельмі азартна, — усміхаецца Валянціна Шуракова. — Госці з абодвух бакоў актыўна «хварэюць» за маладога, падбадзёрваюць яго і даюць парады. Калі ў мужа не вельмі атрымліваецца, на дапамогу прыходзіць «дружына маладога князя» — сябры жаніха. А бывае, маладая адбірае ў мужа лук і трапна пускае стралу ў цэль!

### МАГІЯ КАХАННЯ І ЗГОДЫ

Дарогу перад маладой парай у наступную залу вядучыя густа пасыпаюць старадаўнімі манетамі — такія дэталі вясельнай абраднасці ўзыходзяць да дахрысціянскай магіі ўрадлівасці і багацця.

— У арыгінале маладых трэба абсыпаць манетамі, — тлумачыць суразмоўніца. — Але ж усе гэтыя манеты нам неабходна потым сабраць. А з сукенак сучасных нявест павытрасаць іх нялёгка! Так што ў нас маладыя танчаць на «золаце». Сутнасць абраду захоўваецца: чым больш манет прыліпне да іх падэшваў, тым багацейшае будзе жыццё.

Зрэшты, як расказалі ў музеі, на дарожцы з манет скачуць і госці — усім жа хочацца быць багатымі!

Выпрабаванні падчас вясельнай цырымоніі чакаюць не толькі «князя», але і «княгіню». Напрыклад, дзяўчыне прапануецца папрасаваць ручнік з дапамогай старадаўняга драўлянага праса. Як гэта зрабіць, яна павінна зразумець сама. Зрэшты, падказваць гасцям не забараняецца. За парадай варта звярнуцца да найбольш старэйшых з прысутных. Калі ж і яны занадта маладыя для таго, каб ведаць, як карыстацца прыладай, застаецца мазгавы штурм з удзелам галоўнага дарадцы дзяўчыны з гэтага часу і на ўсё жыццё — яе выбраннікам.

Менавіта тут фатаграфіі атрымліваюцца асабліва цікавыя — часам вясёлыя, часам кранальныя і сімвалічныя, адзначаюць супрацоўнікі музея.

— Напрыклад, прыгожая рука нявесты і побач — натруджаная рука яе прабабулі. І дзве жанчыны разам з дапамогай старадаўняга прыстасавання прасуюць нацыянальны ручнік, на якім традыцыйная старадаўняя вышыўка.

Падчас вандроўкі па экспазіцыі музея пару чакае яшчэ мноства «прыпынкаў». Маладых водзяць вакол стала з караваем — сакральнага цэнтра жыцця сям'і. Гэты хлеб, спечаны паводле ўсіх старадаўніх тонкасцяў, яны павязуць дадому: яго нельга рэзаць да канца вясельных святочных дзён. Маладую саджаюць на накрыты кажухом куфар з пасагам (чым большы быў куфар, тым больш працавітай і ўмелай лічылася жонка). Пары ўручаюцца скураныя куфэркі ручной работы для пярсцёнкаў — свайго роду абярэгі любові і вернасці. Куфэркі гэтыя дораць маладым людзі сталага ўзросту. Прадстаўнікоў горада і найстарэйшых яго жыхароў супрацоўнікі музея абавязкова запрашаюць на правядзенне вясельных цырымоній. Пераемнасць пакаленняў, паняцце «род» у даўніну складалі аснову вясельных абрадаў.

— Акрамя таго, — тлумачыць дырэктар музея, — пажылыя людзі, якія выйшлі на пенсію, часта адчуваюць, што выпалі з жыцця: ім падаецца, што яны сталі непатрэбныя, нібыта перажылі свой час. Мы ж паказваем ім, наколькі іх жыццёвы вопыт важны. Даказваем, што яны запатрабаваныя ў сучасным жыцці. Для іх гэта — стымул жыць далей.

Свацця або сведкам падчас цырымоніі ўпотай ад маладых уручаецца абрадавая лялька-кувадка — магутны славянскі абярэг, які варта падарыць маладым у фінале святочнага вечара. Уласна, такіх лялек дзве, яны сімвалізуюць мужа і жонку, але рука ў іх усяго адна на дваіх: яна ўвасабляе непарыўную сувязь паміж людзьмі, што кахаюць адно аднаго. Гэтую руку трэба берагчы — пакуль яна не надламаная, нябачная нітка кахання трывае і нішто не ў сілах яе разарваць.

**Дзіяна РОНІНА.**


Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| Продавец | ГЛХУ «Червенский лесхоз», 223232, ул. Барыкина, 16, г. Червень, Минская обл., +3751714 52384 |

**Предмет аукциона:** оборудование, бывшее в употреблении
**Месторасположение:** Минская область, г. Червень, ул. Ленинская, ПМУ «Загорье»

| Лот № | Инв. номер | Наименование | Начальная цена, с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | 01241787 | Станок четырехсторонний деревообрабатывающий МП-9 | 935,51 |
| 2 | 01246117 | Станок многопильный двухвальный «Вектор» 2/240 | 46 489,22 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на счет BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390. **Срок внесения задатка по 12.11.2020 г.**

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона

Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденном постановлением Совета Министров РБ от 12 июля 2013 г. № 609 (далее – Положение)

Извещение о проведении аукциона опубликовано на официальном сайте государственного комитета по имуществу (http://gki.gov.by/ru/) 23.10.2020

**Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано на сайте государственного комитета по имуществу от 28.08.2020 г., в газете «Звязда» от 28.08.2020**

**Дата и время проведения аукциона: 16.11.2020 в 12.00** по адресу: ГЛХУ «Червенский лесхоз», Минская область, г. Червень, ул. Ленинская, ПМУ «Загорье».
**Дата и время окончания приема документов: 12.11.2020** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Контактные телефоны**: +375 (17)280-36-37; +375 (44) 704-92-06.
**E-mail:** auction@cpo.by



Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| Продавец | ОАО «БАТЭ» – управляющая компания холдинга «Автокомпоненты», г. Борисов, ул. Даумана, 95 |

**Предмет аукциона:** недвижимое имущество, расположенное по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Даумана, 109

| Наименование (назначение), составные части и принадлежности | Инвентарный номер | Общая площадь |
|---|---|---|
| Магазин (здание специализированное розничной торговли). **Составные части и принадлежности:** двухэтажное кирпичное здание магазина (А1-2/к), пристройка (1), дорожки (а1), декоративный водопад (а2) | 610/С-27467 | 319,1 кв. м |

**Сведения о земельном участке:** общ. пл. 0,0621 га, предоставлен Продавцу на праве аренды сроком по 06.07.2045 г. для строительства и облуживания магазина

**Начальная цена (с НДС 20 %) – 313 062,89 белорусского рубля**

Порядок ознакомления с предметом аукциона: понедельник–пятница с 9.00 до 15.00. Иванов Дмитрий Олегович (главный инженер) +375 29 657-61-84; 8 (0177) 78-84-17

**Задаток 10 % от начальной цены лота** перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| Срок подписания договора купли-продажи | **10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона |

**Условия аукциона**

Покупатель (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %), обязан своими силами и за свой счет возместить Продавцу расходы на рыночную оценку предмета аукциона в размере 150,00 (сто пятьдесят белорусских рублей 00 копеек)

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Продавец или Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| Дата и время проведения аукциона | 24.11.2020 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки» |
| Дата и время окончания приема документов | 23.11.2020 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки» |
| Контактные данные | Тел.: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by |

# ДРУГАЯ СУСВЕТНАЯ ХВАЛЯ

## Як разгортваецца пандэмія?



**Пандэмія каранавіруса ў той ці іншай ступені мела дачыненне фактычна да усіх краін свету і закранула ўсе населеныя кантыненты. Колькасць хворых на COVID-19 імкліва павялічваецца — спраўджваюцца прагнозы аналітыкаў аб нарастанні ўвосень пагрозлівай другой сусветнай хвалі смяротна небяспечнага захворвання. Калі месяц таму я згадваў 30-мільённую мяжу захварэлых, то цяпер гэтая сумная лічба наблізілася да 42 мільёнаў і працягвае расці ў сярэднім на 400 тысяч у суткі, паводле даных Універсітэта Джонса Хопкінса. Памерла больш чым 1,1 мільёна, амаль 75 тысяч чалавек знаходзіцца ў цяжкім і крытычным стане. Пяцёрка найбольш пацярпелых краін — ЗША, Індыя, Бразілія, Расія і Аргенціна. Колькасць захварэлых перавышае 1 мільён і ў Іспаніі, да якой па гэтым паказчыку набліжаюцца Калумбія і Францыя. Як разгортваецца другая сусветная хваля COVID-19, чаго чакаць далей?**

### Рызыкі Старога Свету

Сярод кантынентаў па колькасці новых выпадкаў заражэння каранавірусам лідзіруе Еўропа. Тут на гэтым тыдні адпаведная лічба наблізілася да 200 тысяч чалавек у суткі — абсалютны антырэкорд з пачатку пандэміі. Але ёсць і іншыя ацэнкі. Колькасць ахвяр каранавіруса ў Еўропе перавысіла 250 тысяч, падлічыў нямецкі інфармацыйны тэлеканал n-tv на аснове даных Еўрапейскага цэнтра прафілактыкі і кантролю захворвання (ECDC). Афіцыйна зарэгістраваная колькасць смяротных выпадкаў ад пнеўманіі COVID-19 у еўрапейскіх краінах, уключаючы Расію і Турцыю, склаў 250 039, паведаміла выданне. Пры гэтым найбольшая колькасць памерлых ад наступстваў каранавіруснай інфекцыі — у Вялікабрытаніі (43,7 тысячы), за ёй ідуць Італія, Іспанія і Францыя, у кожнай з якіх зафіксавана больш за 30 тысяч смяротных зыходаў.

Генеральны дырэктар Сусветнай арганізацыі аховы здароўя Тэдрас Гебрэесус б'е трывогу. «Па меры набліжэння ў Паўночным паўшар'і зімовага перыяду адбываецца рэзкі рост колькасці выяўленых выпадкаў захворванняў на COVID-19. Асабліва гэта датычыцца Расіі і Еўропы. Тут у некаторых краінах колькасць інфіцыраваных перавысіла пікавыя паказчыкі сакавіка амаль у тры разы». Тэдрас Гебрэесус таксама адзначыў, што хутка расце колькасць шпіталізаваных. У некаторых краінах магчымы крызіс з недахопам месцаў для пацыентаў у шпіталях. Генеральны дырэктар СААЗ звярнуў увагу на магчымыя эпідэміі грыпу, звязаныя з халодным перыядам, і адзначыў неабходнасць прафілактычнай вакцынацыі пажылых людзей і медыцынскіх работнікаў.

### Небяспечны лакдаўн

Зноў прыйшоў час глабальных каранцінаў. Ірландыя стала першай у Еўропе краінай, якая адважылася пайсці на другі нацыянальны лакдаўн. Апоўначы ў чацвер у краіне ўступілі ў сілу жорсткія абмежаванні, якія будуць доўжыцца шэсць тыдняў. Большасць прадуктовых крам зачынілася. Людзям загадана заставацца дома, выходзіць можна на працу, у выпадку крайняй неабходнасці або для фізічных практыкаванняў, прычым у радыусе не больш за пяць кіламетраў ад дома. Прымаць гасцей забаронена, пад забаронай большасць масавых мерапрыемстваў — акрамя вяселляў і пахаванняў пры захаванні мер бяспекі. Улады Ірландыі чакаюць, што мноства людзей страціць работу. Яны павялічылі дапамогу па беспрацоўі да 350 еўра ў тыдзень для тых, чыя зарплата перавышала 400 еўра за такі ж тэрмін.

Нацыянальны лакдаўн абвясціў і ўрад Чэхіі. З крам працуюць толькі прадуктовыя. Людзі змогуць выходзіць толькі на працу і па крайняй неабходнасці. Прэм'ер-міністр Андрэй Бабіш заявіў, што гэтае рашэнне даецца яму нялёгка, але без нацыянальнага каранціну сістэма аховы здароўя ў краіне не вытрымае нагрузкі ўжо праз тры тыдні. У сераду аб станоўчым аналізе на каранавірус паведаміў намеснік прэм'ер-міністра краіны і міністр унутраных спраў Ян Гамачак. 41-гадовы Гамачак — кіраўнік Сацыял-дэмакратычнай партыі, якая ўваходзіць ва ўрадавую кааліцыю. Адметна, што ён таксама ўзначальвае Цэнтральны крызісны штаб па пандэміі каранавіруса. Міністр замежных спраў Бельгіі 45-гадовая Сафі Вільмес, у якой у мінулую суботу быў знойдзены каранавірус, пераведзена ў рэанімацыю.



Узмоцненыя каранцінныя меры ў шэрагу італьянскіх рэгіёнаў. Як заявіў прэм'ер-міністр Францыі Жан Кастэкс, з пятніцы каменданцкая гадзіна ўведзена яшчэ ў 38 дэпартаментах з-за хуткага распаўсюджвання інфекцыі. «Другая хваля прыйшла, і сітуацыя цяжкая», — сказаў Кастэкс на прэс-канферэнцыі, абвяшчаючы аб мерах, якія наўпрост закрануць распарадак 46 мільёнаў чалавек (дзве траціны насельніцтва Францыі), частка з якіх пражывае на заморскіх тэрыторыях. Кастэкс заявіў, што сітуацыя будзе перагледжана на будучым тыдні і, калі спатрэбіцца, меры будуць больш жорсткія. Пакуль абвешчана, што каменданцкая гадзіна будзе дзейнічаць на працягу шасці тыдняў.

Каменданцкія гадзіны ўведзены і ў шэрагу іншых еўрапейскіх краін. Складаная сітуацыя ў Германіі. Кіраўнік Інстытута Роберта Коха Лотар Вілер назваў сітуацыю надзвычай сур'ёзнай і заклікаў суграмадзян строга выконваць меры бяспекі. Вілер усклаў адказнасць за рэзкі рост захворванняў на моладзь, якая працягвае хадзіць адно да аднаго ў госці і наладжваць вечарынкі ў памяшканнях.

Разам з тым лакдаўны — даволі сумніўная мера, адзначаюць эксперты. Сусветная арганізацыя аховы здароўя (СААЗ) папярэдзіла, што поўнае закрыццё цэлых рэгіёнаў і краін не спыніць распаўсюджванне каранавіруса. Гэта ўсяго толькі спосаб адтэрмінаваць распаўсюджванне інфекцыі, які прывядзе да далейшага збяднення самых малазабяспечаных слаёў насельніцтва. Камісар СААЗ па COVID-19 Дэвід Набара ў сувязі з гэтым заклікае сусветных лідараў не выкарыстоўваць яго як ключавы інструмент у барацьбе з пандэміяй.

«Лакдаўн мае толькі адно наступства, пра якое мы ніколі не павінны забываць, а менавіта тое, што ён робіць бедных яшчэ больш беднымі. Давайце не будзем яго выкарыстоўваць у якасці асноўнага інструмента для барацьбы з эпідэміяй», — заўважыў Набара. Сусветная арганізацыя аховы здароўя папярэджвае, што замарожванне эканомікі і ўсёй сацыяльнай дзейнасці толькі захавае эпідэмію, і як толькі меры будуць адменены, вірус зноў пачне распаўсюджвацца. Так што праблема проста адкладзецца на потым.

«У Сусветнай арганізацыі аховы здароўя мы не лічым лакдаўн галоўным інструментам барацьбы з вірусам. Лічым яго апраўданым толькі ў тым выпадку, калі ён будзе выкарыстаны для рэарганізацыі — перагрупоўкі сіл і абароны знясіленага медыцынскага персаналу. Але ў цэлым мы аддалі б перавагу таму, каб гэтага не рабіць», — адзначыў Набара. Эксперт заўважыў, што ўрады павінны знайсці разумны баланс паміж уздзеяннем на грамадскае здароўе і эканоміку.

### Тэсты і вакцыны

Час на правядзенне даследаванняў на «ковід» максімальна скароціцца. Навукоўцы з Сінгапура прадставілі новы тэст, які дазволіць вызначаць наяўнасць у чалавека каранавіруса па яго дыханні. Пра гэта паведаміла кампанія-распрацоўнік Breathonix. Па словах аднаго з кіраўнікоў праекта, прадстаўніка Нацыянальнага ўніверсітэта Сінгапура Цзя Чжунаня, «выкарыстанне падобных тэстэраў не патрабуе спецыяльна навучанага персаналу, дыягностыка можа праводзіцца ў найбольш ажыўленых месцах, напрыклад аэрапортах». Вынікі тэста можна будзе атрымаць на працягу некалькіх хвілін.

Вірусолаг з Бонскага ўніверсітэта Хендрык Штрэк абвясціў аб правядзенні новага даследавання ў акрузе Хайнсберг, якая ў лютым стала ачагом распаўсюджвання каранавіруса ў Германіі. У ходзе даследавання мяркуецца, у прыватнасці, вывучыць верагоднасць паўторнага інфіцыравання COVID-19, заявіў ён у відэазвароце да жыхароў акругі ў Facebook. Па словах навукоўца, гэтыя даныя важныя для фарміравання мер супраць распаўсюджвання захворвання на той выпадак, калі ў найбліжэйшыя месяцы не з'явіцца надзейная вакцына.

Мяркуючы па выніках даследавання, праведзенага ў 19 краінах свету, большасць грамадзян гатовыя прышчапіцца ад каранавіруса. 71,5 працэнта апытаных заявілі, што «з высокай доляй верагоднасці» ці «верагодна» прымуць удзел у вакцынацыі ад COVID-19, пасля таго як будзе даступны адпаведны прэпарат. Пры гэтым 61,4 працэнта рэспандэнтаў адзначылі, што ўлічаць рэкамендацыю свайго працадаўцы ў сувязі з гэтым. У праведзеным у чэрвені апытанні праекта Vaccine Confidence, прафінансаваным Еўрапейскай камісіяй і фармаканцэрнамі, удзельнічала каля 13 тысяч чалавек па ўсім свеце.

Аднак пры гэтым варта быць надзвычай абачлівымі. Старшыня Сусветнай медыцынскай асацыяцыі Франк Ульрых Мантгомеры перасцярог ад паспешлівых рашэнняў аб тым, каму варта раней за ўсіх рабіць прышчэпку ад COVID-19 пры з'яўленні вакцыны. «Важна наогул мець вакцыну ў наяўнасці», — прыводзяць яго словы выданні медыягрупы Funke. Па словах Мантгомеры, рашэнне аб першачарговасці прышчэпак залежыць і ад характарыстык вакцын. Яны грунтуюцца на розных фармакалагічных прынцыпах, таму некаторыя могуць апынуцца неэфектыўныя для пажылых людзей, патлумачыў эксперт.

### Паміж успышкамі

У Польшчы зацвердзілі падзел на «чырвоную» і «жоўтую» зоны. У «чырвоных» рэгіёнах забароненыя сходы больш за дзесяць чалавек, а таксама ўсе ўрачыстыя мерапрыемствы. Прэм'ер-міністр Польшчы Матэўш Маравецкі заявіў пра пагрозу трэцяй хвалі каранавіруснай інфекцыі, нягледзячы на тое што ў краіне цяпер «маюць справу» з другой хваляй пандэміі. «Мы сутыкнуліся сёння з вельмі небяспечнай з'явай — другой хваляй, і тут трэба сказаць таксама, што, магчыма, нам пагражае трэцяя хваля, таму што мы залежым ад таго, ці будуць вынайдзены лекі або вакцына ад COVID-19», — заявіў Маравецкі падчас выступлення ў парламенце.

Пры гэтым Ганконг, як паведамляе South China Morning Post, рыхтуецца ўжо нават не да трэцяй, а да чацвёртай хвалі. Улады адміністрацыйнага раёна Кітая змякчылі меры сацыяльнага дыстанцыявання, а таксама абмежаванні на ўезд у рэгіён. Такія паслабленні могуць прывесці да росту нявыяўленых інфіцыраваных, а таксама да таго, што турысты будуць прыязджаць з небяспечным багажом. Вынікам, на думку спецыялістаў, стане наступленне ўжо чацвёртай хвалі каранавіруса. Яны заклікаюць як мінімум правесці максімальна шырокую кампанію па вакцынацыі ад грыпу і вучыцца на атрыманым вопыце. Пра тое, што Ганконг перажыў ужо трэцюю хвалю эпідэміі, яшчэ 25 верасня заявіла кіраўнік рэгіёна Кэры Лам. Паводле яе слоў, гэта быў двухмесячны перыяд, які пачаўся яшчэ ў ліпені.

Тым часам медыкі нарвежскага горада Тронхейм сцвярджаюць, што сутыкнуліся з новым тыпам каранавіруса. Спецыялісты выставілі такую здагадку пасля ўспляску заражэнняў. Першасны аналіз паказаў, што з такім варыянтам віруса медыкі раней не сутыкаліся, прыводзіць выданне Dagbladet словы галоўнага ўрача горада Тувэ Роста-да. Узоры віруса з мясцовай бальніцы былі адпраўленыя на даследаванне ў Інстытут грамадскага здароўя Нарвегіі. Дакладныя ўласцівасці новага тыпу віруса пакуль невядомыя. Эксперты дапускаюць, што заразіцца ім лягчэй, але не сцвярджаюць, што захворванне будзе працякаць у больш цяжкай форме. Пандэмія працягваецца.



**Захар БУРАК.**

IdeaBank
Отличная идея!

Наименование банка: **ЗАО «Идея Банк»**

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 1 октября 2020 года

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | На 1 октября 2020 | На 1 января 2020 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 51 994 | 55 435 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 0 | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 47 157 | 50 613 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 24 468 | 16 108 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 0 | - |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 327 117 | 342 726 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 0 | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 5 | 5 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 24 301 | 24 170 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | 5 828 | 7 234 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 2 525 | 2 525 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | 33 | 67 |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 8 766 | 13 805 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 492 194 | 512 688 |
| 16 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 26 476 | 12 546 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 362 744 | 397 283 |
| 20 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 14 114 | 15 153 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 0 | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | 0 | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 2 004 | 2 861 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 405 338 | 427 843 |
| 25 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 40 000 | 40 000 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | 0 | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 12 583 | 7 523 |
| 29 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 9 653 | 10 383 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 24 620 | 26 939 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 86 856 | 84 845 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 492 194 | 512 688 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
на 1 октября 2020 года

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | На 1 октября 2020 | На 1 октября 2019 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 35 446 | 36 707 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 20 264 | 18 421 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 15 182 | 18 286 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 10 284 | 11 072 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 6 436 | 5 065 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 3 848 | 6 007 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | 0 | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 0 | (1) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 13 933 | 7 958 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 0 | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 5 280 | 2 000 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 3 748 | 2 390 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 25 731 | 24 644 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 2 364 | 2 328 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 3 336 | 5 668 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 1 325 | 1 860 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 2 011 | 3 808 |

Председатель Правления Е.М. Папушева



Заместитель главного бухгалтера А.В. Азаревич

16 октября 2020 года

УНП 807000122.

**Первичная профсоюзная организация производственно-торгового унитарного предприятия «ОРС № 2» ОАО «Белтрубопроводстрой» Белорусского профессионального союза работников нефтяной и газовой промышленности ликвидируется.**

Претензии принимаются в течение 2 месяцев по тел. (8-017) 218-24-46. Свидетельство и печать считать недействительными в связи с утерей.

УНП 100073619

БЕЛАРУСБАНК

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

## Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже недвижимого имущества – ОАО «АСБ Беларусбанк» (Гомельское областное управление № 300)

**ЛОТ 1: наименование объекта продажи – капитальное строение общей площадью 110,9 м², с инвентарным номером 330/С-23455, расположенное в Гомельской области, Мозырский район, аг. Козенки, ул. Спортивная, 50Г.**

Начальная цена продажи составляет 40 943,46 белорусских рублей (сорок тысяч девятьсот сорок три рубля 46 копеек) с учетом НДС.

Сумма задатка – 500,00 рублей (пятьсот рублей 00 копеек).

Победителем аукциона оплачивается имущество, относящееся к объекту недвижимости: роллета – 400,00 руб., роллета (1,05*2,1) – 236,00 руб., роллета (1,65*2,1) – 268,00 руб. в количестве 7 штук, роллета (1,02*0,71) – 55,42 руб. в количестве 3 штук, щиток распределительный ЩУР-01 – 115,55 руб., регулятор расхода – 14,89 руб., теплосчетчик ТС-05 4 – 10,07 руб., приточная уст. в комплекте со шкафом (вентиляция) – 120,00 руб. на общую стоимость 2 938,77 руб. в том числе НДС по ставке 20 %.

**ЛОТ 2: наименование объекта продажи – изолированное помещение с инвентарным номером 324/D-5491 (гараж), общей площадью 26 м², расположенное в Гомельской области, г. Чечерск, ул. Первомайская, 16/1-2.**

Начальная цена продажи составляет 5 830,24 рублей (пять тысяч восемьсот тридцать рублей 24 копейки) с учетом НДС.

Сумма задатка – 200,00 рублей (двести рублей 00 копеек).

Открытый аукцион состоится **25.11.2020 в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Фрунзе, 6а, комната переговоров (помещение на третьем этаже).

Заявление на участие принимается в рабочие дни с 9.00 до 17.00, в пятницу – до 15.45 по 24.11.2020 включительно по адресу: г. Гомель, ул. Карповича, 21, кабинет 3 (тел. (0232) 51 21 32 , 51 21 30).

Продавец – ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи заключается с ОАО «АСБ Беларусбанк» и регистрируется в органе по государственной регистрации по месту нахождения объекта.

По вопросам, связанным с объектами продажи, обращаться по телефону (0232) 51 21 32 – Ладыженко Светлана Станиславовна.

Для участия в открытом аукционе предоставляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка по 24.11.2020 включительно на счет № BY69AKBB66708597000020000000, БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 100325912.

К заявлению также прилагаются:

юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

